№№201–202
(3127–3128)
24–28 снежня 2009 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

**Да ўвагі!**
**Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!**

# Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выходзі, мой народ, грамадою...*
*Якуб КОЛАС*

**УВАГА!**
**«Белпошта» працягнула падпіску на «Народную Волю» да 29 снежня. Хто спазніўся — калі ласка, вас чакаюць на пошце. Не здрадзьце «Народнай Волі!»**

# Праўда Божага нараджэння — нязменная праўда ў зменлівасці сучаснага свету

## *З пастырскага паслання арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча*

*"Абвяшчаю вам вялікую радасць: нарадзіўся сёння Збаўца, якім ёсць Хрыстус Пан" (Лк 2, 10-11)*

Глыбокапаважаныя святары, кансэкраваныя асобы, браты і сёстры!

1. Гэтымі ўрачыстымі словамі анёла ад усяго сэрца вітаю вас і віншую з радаснай і збаўчай урачыстасцю Нараджэння Пана. Падзея, якая адбылася больш за 2000 гадоў таму ў Бэтлееме, на самай справе стала пераломным момантам у гісторыі чалавецтва, якое чакала свайго збаўлення.

Кожны год мы адзначаем гэтае свята. Кожны год спяваем радасныя калядкі, у якіх выражана праўда пра цудоўнае Божае ўцелаўленне. Кожны год уносіць таксама новыя элементы ў святкаванне Божага Нараджэння. Гэта перш за ўсё элементы, звязаныя з канкрэтнай сітуацыяй, у якой жыве чалавек, звязаныя з выклікамі часу, на якія трэба адказваць.

2. Адным з такіх выклікаў з'яўляецца неабходнасць адказу на цывілізацыю акультызму, міфаў, міражоў і ілюзій, якая ўсё больш распаўсюджваецца ў сучасным свеце. Праблема ў тым, што нашу эпоху можна назваць эпохай лёгкавернасці. Рэклама, якой становіцца ўсё больш, абяцае лёгкае шчасце. Многія адварочваюцца ад хрысціянства і пачынаюць верыць у магію, займацца акультызмам і г.д. Не вельмі дапамагае і адукацыя, бо, як паказвае жыццё, гэтым шляхам ідзе таксама нямала высокаадукаваных асобаў.

3. Касцёл, аднак, цвёрда стаіць на хрысціянскіх прынцыпах і бароніць іх. Ён таксама заклікае да аховы духоўных каштоўнасцяў, як каштоўнасцяў базавых, каб на іх будаваць жыццё. Трэба ўсвядоміць, што не грамадская ці публічная думка і нават не парламенцкая большасць вырашаюць, чым ёсць праўда. Бо яна, на самой справе, нічога не мае адносна колькасці людзей, перакананых у ёй. Нездарма яшчэ Пілат пытаўся ў Хрыста: што ёсць праўда? *(пар. Ян 18, 38)* Хрыстус жа кажа, што менавіта Ён і ёсць праўда, дарога і жыццё *(пар. Ян 14, 6)*.

4. Сёння існуе тэндэнцыя прымаць усё тое, што новае, як лепшае. Несумненна, развіццё навукі, новыя тэхналогіі і новы стыль жыцця нясуць у сабе многа пазітыўнага і спрыяюць развіццю чалавека і яго жыцця. Аднак праблема ў тым, што іх выкарыстанне не заўсёды адпавядае маральным нормам.

Змяняюцца таксама погляды на каштоўнасці жыцця і чалавечую маральнасць, у выніку чаго распаўсюджваецца маральны рэлятывізм. Паспяховымі і сучаснымі лічацца тыя, хто дазваляе карыстанне кантрацэптыўнымі сродкамі, дасужэнскае сексуальнае жыццё, разводы, гомасексуальныя і свабодныя саюзы, аборты, эўтаназію, эксперыменты, якія вядуць да забойства чалавечых эмбрыёнаў і г.д. Сучаснымі, а таму і лепшымі, лічацца разводы, а не сужэнская вернасць; свабодныя саюзы, а не сакраментальнае сужэнства; выхаванне дзяцей адным з бацькоў, а не ў поўнай сям'і.

Ці можна сумясціць сучаснасць з евангельскім радыкалізмам? Можна! Усё залежыць ад чалавека, бо можна жыць сучасным прагрэсіўным жыццём, захоўваючы Божы закон.



Сёння мы з'яўляемся сведкамі таксама экалагічнага крызісу, выкліканага амаральным асвойваннем прыродных багаццяў. Іх несправядлівае выкарыстанне ў сваю чаргу вядзе да абагачэння адных за кошт іншых.

Гледзячы на сучасны свет, можна сказаць, што амаральнасць у ім сапраўды стала публічнай справай, а рэлігійнасці імкнуцца надаць статус прыватнай або нават зусім выключыць яе з жыцця.

5. У такой складанай сітуацыі трэба ўмець убачыць двухсэнсавасць прагрэсу. Сапраўды, новае стварае новыя магчымасці для дасягнення дабра, аднак у той жа час і правакуе зло.

Найлепшым доказам таго, што сам па сабе прагрэс без духоўнага складніка не вядзе людзей да поўнага шчасця, з'яўляецца сучасны эканамічны крызіс. Больш за тое, узнікае няроўнасць сярод людзей і рост беднасці, якая пагражае дэмакратыі і мае негатыўны ўплыў у эканамічнай сферы, — навучае папа Бенедыкт XVI *(пар. CV 32)*.

Адна вера ў прагрэс і імкненне да багацця без духоўнага элементу не збавяць чалавека і не ўчыняць яго шчаслівым. Калі няма веры ў Бога, то прагрэс, падпарадкаваны толькі чалавеку, не будзе служыць яму, а наадварот — стане пагрозай.

6. Сёння мы разважаем над цудам Божага Уцелаўлення, які адбыўся ў Бэтлееме. Ні Марыя, ні Юзаф не шукалі шчасця ў тэндэнцыях сучаснага ім свету, у якім таксама існавала імкненне да прагрэсу і багацця. Пра іх мы ведаем, што яны былі беднымі і на жыцці зараблялі працаю сваіх рук.

Аднак, і гэта трэба падкрэсліць, менавіта ў Бэтлееме, у беднай сям'і, свет убачыў уцелаўлёнага Бога — доўгачаканага Збаўцу, найвялікшую каштоўнасць. Вось дзе праявілася сапраўдная радасць і шчасце. Сапраўды, Божая моц і слава праяўляюцца ў прастаце і слабасці *(пар. 2 Кар 12, 9)*.

А народжаны ў Бэтлееме Сын Божы — гэта не міф, не ілюзія, а рэальнасць, дзякуючы якой Бог у чалавечым вобразе ўвайшоў у гісторыю чалавецтва, каб яго збавіць і даць магчымасць чалавеку зразумець самога сябе, а таксама сэнс свайго жыцця. Нездарма папа Ян Павел II кажа, што толькі ў Хрысце чалавек можа пазнаць самога сябе *(пар. МоЗ с. 26)*.

7. Віншуючы вас і складаючы вам, дарагія вернікі і ўсе людзі добрай волі, найлепшыя святочныя пажаданні, заклікаю вас заўсёды заставацца вернымі свайму хрысціянскаму пакліканню.

Сваімі пажаданнямі абдымаю іншых хрысціянаў — тых, якія сёння таксама святкуюць Божае Нараджэнне, а таксама праваслаўных, якія перажываюць Адвэнт і духоўна рыхтуюцца да раднаснага свята. Сучасны свет, які заблукаў у міфах сучаснасці, патрабуе нашага супольнага сведчання, каб паказаць яму адзіны і нязменны шлях — Езуса Хрыста. Ён з'яўляецца адзіным Збаўцам — учора, сёння і заўсёды *(пар. Габр 13, 8)*.

Радуе тое, што пазіцыі Каталіцкага Касцёла і Праваслаўнай Царквы па найбольш актуальных праблемах сучаснасці вельмі блізкія. Гэты год, які ідзе да завяршэння, зблізіў іх яшчэ больш, таму ў многіх выпадках можна гаварыць нават пра тое, што мы ва унісон абараняем хрысціянскія каштоўнасці і навучаем, што будучыню трэба будаваць не толькі на прагрэсе, але таксама на этычных прынцыпах.

Таму сёння мы звяртаемся да нованароджанага Дзіцятка Езус, каб адарыў нас сваёю ласкай, каб мы прынялі Яго як нязменны пункт аднясення ў вырашэнні ўсіх праблем сучаснага свету.

Радасці, шчасця, благаслаўлення Божага Дзіцяці ўсім вам.

Са святам, з Божым Нараджэннем!

Давяраючы ўсіх вас апецы Марыі, якая дала свету Збаўцу, ад усяго сэрца дзялюся з вамі аплаткам і благаслаўляю ў імя Айца, і Сына, і Духа Святога. Амэн.

**Арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.**

**Фота photo.bymedia.net**

## *Больш «лібералізацыі» — больш палітвязняў?*

**Аргкамітэт грамадскай ініцыятывы "Хартыя'97" уручыў штогадовую прэмію грамадска-палітычным дзеячам Беларусі.**

На жаль, восем з дзесяці адзначаных дыпломамі не змаглі прысутнічаць на ўшанаванні. Большасць з іх знаходзіцца за кратамі. Гэта, па словах арганізатараў, найярчэй сведчыць аб лібералізацыі, якая нібыта адбываецца ў краіне.

Узнагародай "Хартыі'97" былі адзначаны каардынатар "Еўрапейскай Беларусі" **Зміцер Бародка**, грамадскі актывіст **Максім Вінярскі**, завочна дыпломы атрымалі палітвязні **Міхаіл Аўтуховіч**, **Юрый Лявонаў**, **Уладзімір Асіпенка**, а таксама **Франак Вячорка**, які зараз праходзіць прымусовую службу ў войску.

За зняволенага маладзёжнага актывіста **Арцёма Дубскага** прэмію атрымала яго маці, а пасмяротную ўзнагароду **Яне Паляковай** журналістка **Ірына Халіп** перадала праваабаронцу **Валерыю Шчукіну**.

Каардынатар "Хартыі'97" **Зміцер Бандарэнка** так ацэньвае сёлетнюю прэмію: "*Гэтая прэмія была праведзена па выніках года "лібералізацыі". Канечне, у краіне значна больш тых, каго варта было б адзначыць. Але прэмія штогадовая і будзем спадзявацца, што ў наступным годзе ў нас будзе менш палітзняволеных*".

**Марыя МАЛЕВІЧ.**

## *Графік святочных вакацый амбасад*

**Калі ў вас у бліжэйшыя тыдні будзе неабходнасць звярнуцца ў амбасады замежных краін, то майце на ўвазе графік святочных вакацый амбасад.**

Амбасада Балгарыі: з 24 па 27 снежня і з 31 снежня па 3 студзеня.

Амбасада Вялікабрытаніі: дакументы на візу не прымаюцца і не выдаюцца з 24 снежня па 3 студзеня, а таксама 7 студзеня.

Амбасада Германіі: 24, 25 і 31 снежня, а таксама 1 і 7 студзеня.

Амбасада Італіі: 25 снежня, а таксама 1, 6 і 7 студзеня.

Амбасада Літвы: з 25 па 27 снежня, 1 студзеня.

Амбасада Латвіі: з 24 па 27 снежня і з 31 снежня па 3 студзеня.

Амбасада Польшчы: з 25 па 27 снежня, а таксама 1 і 7 студзеня.

Амбасада Славакіі: з 24 па 27 снежня, а таксама 1, 6 і 7 студзеня.

Амбасада Францыі: 24 і 31 снежня пасольства будзе працаваць па скарочаным графіку, выхадныя: 25--27 снежня, 1 і 7 студзеня.

Амбасада Чэхіі: з 25 па 27 снежня, а таксама 1 і 7 студзеня.

Амбасада Швецыі: 24, 25, 31 снежня, а таксама 1, 6, 7 і 8 студзеня.

Амбасада Эстоніі: з 21 па 27 снежня, з 31 снежня па 3 студзеня, 7 студзеня.

*Паводле агенцтва "Інтэрфакс".*

**ДИПКУРЬЕР**

# Александр Суриков белорусской оппозиции не симпатизирует

**Об этом Чрезвычайный и Полномочный Посол Российской Федерации в Беларуси Александр Суриков сказал, отвечая на вопросы "Народной Воли" на пресс-конференции, посвященной итогам уходящего 2009 года.**

**— Александр Александрович, на пресс-конференции с белорусскими журналистами президент Медведев дал понять, что считает возможной свою встречу с оппозиционными белорусскими политиками. Ведет ли уже посольство подготовку такой встречи? И вы сами кому из наших оппозиционных политиков чисто по-человечески симпатизируете?**

— Насколько я информирован, президент Российской Федерации не занимается подготовкой встречи с ведущими оппозиционными политиками. И слово "ведущими" употреблено, наверное, здесь не очень точно. Ведущие — это те, кто ведет за собой какую-то массу. С точки зрения массы у вас в оппозиции раскол на два лагеря пока, и там еще подлагеря есть. А вот Лукашенко — ведущий политик, это мы признаем однозначно. Потому что основная масса избирателей все-таки за Александра Григорьевича. Вот с этим политиком наверняка будут проработки программы работы российского президента на будущий год. С учетом встреч с этим ведущим политиком Беларуси. Но не с теми, о ком вы говорите.

**— А про симпатии?**

— Я, честно говоря, не могу выразить никому своих симпатий. Мне приходилось встречаться с ними, и не один раз. Больше, правда, на приемах мы пересекаемся... Мне однозначно не нравится их заточенность против почему-то Александра Григорьевича Лукашенко. Им наплевать на все: на народ, на государство... Вот против Лукашенко и все! Почему? Объяснить не могут. Не нравится жесткость, тоталитарность власти. Она многим не нравится, может быть, и в других странах. Но Беларусь, по моим пониманиям, из той ямы, в которой она находилась в начале и в середине 90-х годов, вытащить можно было только с помощью жестких рычагов. И больше никак. А вот им это не нравится... Демократия, граничащая с анархией. Что хочу, то и ворочу. У нас это было... Поэтому период становления демократии еще предстоит пройти и Российской Федерации, и Беларуси. Так, как положено, нормально. Но демократии, а не анархии. И тогда появятся и политики, уже не оппозиционные, а просто демократические. И мы выберем, кто нам понравится.



**— На днях в "Московском комсомольце" вышла статья под заголовком "Батька перешел на экспорт уголовников", в которой рассказывалось о том, как гражданина Беларуси, который из своих 48 лет 32 года провел в тюрьмах, депортировали в Россию... Вы наверняка читали...**

— Я читаю много, в том числе и это читал. Но нельзя же на примере одного-единственного человека проводить как бы... Возводить в ранг государственной политики...

**— Но были и другие случаи, когда из Беларуси депортировали российских бизнесменов, проживших здесь больше 10 лет...**

— Это были единичные случаи. И это не ранг государственной власти, это ошибки органов, которые этим занимались...

**Марина КОКТЫШ.**

**НЕОБЫЧНЫЙ РАКУРС**

# О Путине бедном замолвите слово...

Недавняя встреча президента России Д. Медведева с белорусскими журналистами — событие закономерное. Последней каплей терпения Кремля стала, видимо, седьмая по счету пресс-конференция А.Лукашенко для российских СМИ, прошедшая 2 октября. Имя российского премьер-министра было упомянуто в негативном контексте чуть ли не двадцать раз.

### Кое-что о "глупости"

*Начнем с энергетики. А.Лукашенко критикует российское руководство: "Не нравятся маршруты по Беларуси транспортировки газа и нефти — давайте вбухаем до 25 миллиардов, построим "Норд стрим", "Южный поток" и так далее. Зачем? Ведь есть вся инфраструктура. Когда строили Ямал—Европа, газопровод новейший, положили инфраструктуру, от фундамента до электроэнергии, связи, электричества. Положили под вторую трубу. Кладите. Зачем лезть на эту Балтику?"*

Александр Григорьевич, вы это всерьез сказали или с присущей вам крестьянской хитростью под конюха скосили?

Россия не от хорошей жизни "полезла" на Балтику. Развернем школьную карту. Между Россией и Германией, кроме Беларуси, лежит еще и Польша, по-прежнему считающая себя Сторожевой башней западной цивилизации на востоке. Со всеми, как говорится, вытекающими. Кремлю как-то не с руки менять историческое самосознание поляков, тем более что "старший брат" у них уже есть — на Потомаке сигарой попыхивает. Зачем Москве иметь газовые заморочки еще и с Варшавой? Хватит Киева.

Строительство "Северного потока", равно как и "Южного", обозреватели официальных белорусских СМИ назвали глупостью. Ладно, с них взятки гладки. Может, в детстве игрушками обделили. Но ведь есть у нашего государства более солидные ведомства — зарубежные посольства, разведка в конце концов. Приехал в Германию и глазей по сторонам. Никакого риска. Смотри, как немцы в открытую копают землю под огромные газохранилища. Роют, несмотря на многочисленные предостережения о блокировке "Северного потока" странами Балтии. Чем закончилось? Швеция, Дания и Финляндия, убедившись в экологической безопасности проекта, зажгли на его пути зеленый свет. Кроме глубокого морального удовлетворения названные страны наверняка получили определенные бонусы. Финны, например, русский лес-кругляк по приемлемой цене. Что касается Польши или Эстонии, так их претензии изначально не имели юридической силы. Короче, вляпались белорусы со своей "глупостью" по самое не могу. Хотя материал для анализа, следовательно, для надлежащего вывода лежал на поверхности.

США вон как связаны с Израилем, а по части самых больших секретов — табачок врозь. Даже шпионят периодически друг против друга. Москва явно не спешит делиться с Минском стратегическими планами, рассчитанными по отдельным направлениям на 20—30 лет вперед. На то есть множество причин. Нервничать из-за этого и тем более впадать в истерику белорусскому руководству не стоит.

### Лирическое отступление

Господин президент! Прикажите, пожалуйста, выделить три полноценные ставки. Плюс небольшую комнату и соответствующую оргтехнику. Мы, внештатные авторы "Народной Воли", разделим три ставки на человек пять-семь и начнем работать на благо Отчизны. В казне лишних денег нет? Знаем. Они могут появиться, если избавитесь (в плуг их запрягите, в плуг) от огромного числа прилипал, осевших в различных информационно-исследовательских конторах. Не менее 95 процентов их "аналитики" без всяких последствий для безопасности страны можно смело выбрасывать в урну. Дайте им несколько домашних заданий. Кто станет новым президентом Украины? Состоится ли в будущем году на белорусской земле встреча Патриарха Русской Православной Церкви Кирилла с Папой Римским Бенедиктом XVI? Или она пройдет все-таки на территории Португалии? Или ее вообще не будет? Появятся проблемы с поставкой российской сырой нефти в Беларусь в ближайшие полтора года или они начнутся лишь после того, как заработает нефтепровод в обход нашей страны (БТС-2) в 2012 году? Уйдет ли в 2010 году с поста мэра Москвы Ю.Лужков или, наоборот, уцелеет и даже поставит памятник непременно работы Церетели своему другу Т.Исмаилову, бывшему директору Черкизовского рынка? Как "они", хозяйничающие в Белокаменной, отплясывали на открытии исмаиловского суперотеля в Турции! Танцуют, а на головы им падают стодолларовые купюры. Настоящие. 60 миллионов под ноги просыпалось. Конкретные пацаны вперемешку с голливудскими звездами. И как мы будем выглядеть, если у миллиардерши Батуриной, супруги Лужкова, возникнут проблемы по аналогии с Ходорковским? Как быть тогда с ее белорусскими активами?

Просматривается опасность, что в Беларусь вслед за московскими казино (криминализация белорусской столицы, включая наркоманию, неизбежна) могут гуськом потянуться и некоторые олигархи, у которых отношения с тандемом Медведев—Путин не сложились. Кстати, о казино. В Польше игровые заведения принесли в прошлом году доход госказне всего в 4 млн евро. Делим на два и получаем возможный белорусский навар. Так стоит ли ради такой суммы превращать двухмиллионный Минск в отстойник человеческих слабостей и пороков?

Вопросов много возникает. Без ясного ответа на них ни внутреннюю, ни тем более внешнюю политику страны выстроить невозможно. Так что не скупитесь, Александр Григорьевич! Газета "Народная Воля", при которой может быть аналитическая группа, по статусу частная, но по содержанию — державная. Втолкуйте эту очевидную истину своим незадачливым идеологам. В качестве своеобразного аванса, господин президент, мы все же на один из вышеперечисленных вопросов ответим. Президентом Украины в 2010 году станет Юлия Тимошенко. Почти одинаково в таком исходе заинтересованы главные "наблюдатели" США и Россия. Американцы на В.Ющенко уже не рассчитывают. На подготовку равноценного дублера времени не хватает. И попробуй найди ему жену-американку, как это было с В.Ющенко. Что касается В.Януковича, то его избрание почти со стопроцентной неизбежностью сулило бы России крупные геополитические неприятности в будущем. В.Янукович в силу многих обстоятельств профукал бы за четыре года весь пророссийский ресурс — левобережную Украину плюс Одессу. На сегодня Россия и США ссориться между собой по-крупному из-за Украины не готовы. Победит обладательница золотой косы (акции) Ю.Тимошенко.

### Стыдобище

Почему у нас туго с прогнозами? Политических партий и всевозможных объединений в стране несколько десятков. Влияние же их на общественную жизнь мизерно. Возьмем компартию, возглавляемую депутатом парламента Т. Голубевой. Если верить бумагам, в КПБ состоит свыше пяти тысяч человек. Средний возраст вплотную приближается к семидесяти годам. Притока молодежи не предвидится. Недавно в одном из райкомов Минска было исключено несколько десятков молодых членов партии за... неуплату взносов. Вы когда-нибудь видели, чтобы на Белорусском телевидении выступили с альтернативным мнением члены ЦК КПБ? Зато они явочным порядком убрали В. Драко с поста первого секретаря Минского горкома КПБ. Убрали, исключив из партии, несмотря на яростные протесты большинства членов горкома. За что? Со слов самого Валерия Владимировича, за то, что организовал в рамках закона пикет у посольства одной из ближневосточных стран.

Власть и ее "приводные ремни" собственной тени боятся. Обратной связи с обществом нет. Последние кадровые назначения наверху — тому свидетельство. Неужели королевской "охоты на ведьм" дождемся?

Исключили из Союза писателей Беларуси известного романиста и поэта Эдуарда Скобелева. О нем российские литературные критики высказывались всегда с особым пиететом. Кое-кому и скорее всего Н.Чергинцу, председателю писательского союза, не понравился роман Э. Скобелева "Завещание Сталина". Ну и что? Мне тоже не все в романе по нраву пришлось. Но изгонять коллегу из творческого Союза за несколько спорных абзацев? Стыдобище! Особенно с учетом того, что власть сама построила "Линию Сталина". Ту самую, что придумал в 1941 году не кто иной, как Геббельс. Об этом "Народная Воля " уже подробно писала.

### На Восток побежим?

Многие белорусы, особенно молодые, в поисках материального благополучия и духовной свободы уезжают на Запад. Скоро начнут вострить лыжи на Восток. Нынешние белорусские идеологи "погрызли" не только одного Э.Скобелева.

*(Окончание на 2-й стр.)*

## *Пенсіі — датэрмінова!*

**РУП "Белпошта" скарэкціравала графік выплаты пенсій у сувязі з будучымі Каляднымі і Навагоднімі святамі.**

Датэрміновая выплата пенсій (дапамогі) за 25 снежня ў Мінску, Брэсцкай і Мінскай абласцях ужо стартавала, у Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях пачынаецца сёння, з 24 снежня.

Што тычыцца тых, хто атрымоўвае пенсію на пачатку месяца, то ў РУП "Белпошта" растлумачылі наступнае: у адпаведнасці з устаноўленым графікам выплата пенсій з першага дня месяца ажыццяўляецца толькі ў Мінску і Віцебскай вобласці (у астатніх рэгіёнах — з пятага чысла месяца). Датэрміновая выплата пенсій (дапамог) у Мінску за 1—3 студзеня 2010 года пачнецца з 29 снежня бягучага года. У Віцебскай вобласці датэрміновая выплата за 1 студзеня 2010 года будзе праведзена 29 снежня бягучага года, за 2 студзеня — 30 снежня, за 3 студзеня — 31 снежня.

Датэрміновая выплата пенсій (дапамог) за 7 студзеня ў Мінску пачнецца 4 студзеня, у Брэсцкай і Віцебскай абласцях — 5 студзеня, у Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях — 6 студзеня.

Дарэчы, 2 і 8 студзеня 2010 года з'яўляюцца працоўнымі днямі для ўсіх аддзяленняў паштовай сувязі, а 25 снежня 2009 года, 1 і 7 студзеня 2010 года будуць функцыянаваць толькі дзяжурныя аддзяленні паштовай сувязі.

ЛЁСАВЫЗНАЧАЛЬНАЯ ТЭМА

# Баба Шура сказала сваё слова. А ці скажа сваё слова прэзідэнт?

Нагадаю: у чэрвені 2009 года вялікая група вучоных, дзеячаў мастацтва, пісьменнікаў і іншых катэгорый грамадзян звярнулася з лістом да А.Лукашэнкі, кіраўнікоў заканадаўчай і выканаўчай галін улады Б.Батуры, У.Андрэйчанкі, С.Сідорскага, міністраў і ўсіх грамадзян Беларусі. У звароце была адна просьба да высокіх чыноўнікаў: прыняць неадкладныя меры на дзяржаўным узроўні па адраджэнні і далейшым развіцці беларускай мовы. Галоўнае, што патрабуецца, — запаліць "зялёнае святло" роднаму слову ў дзіцячых садках, школах, гімназіях, ліцэях, каледжах, адкрыць беларускамоўны універсітэт, інстытуты, у якіх дзеці беларусаў маглі б вучыцца на сваёй мове.

Размова вядзецца не аб прымусовым навучанні ў беларускіх ВНУ, а аб прадастаўленні магчымасці новым пакаленням беларусаў вучыцца на роднай мове, што было б для іх радасцю.

Што і казаць, моўная сітуацыя ў Беларусі набыла, можна сказаць, катастрафічны характар. Кіраўніцтва краіны вельмі неашчадна ставіцца да скарбу нацыі. Ёсць Закон "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь", але і ён, на жаль, не выконваецца.

Пісьменнікі ўжо не аднойчы атрымлівалі адказы ад Міністэрства адукацыі, у якіх высокія чыноўнікі сцвярджаюць, што немэтазгодна адкрываць беларускамоўны універсітэт, яны лічаць, што беларуская мова не запатрабавана грамадствам і аб ёй, маўляў, няхай клапоціцца сама інтэлігенцыя. Колькі цынізму, здзеку ў падобных сцвярджэннях! Скажыце, калі ласка, ці будуць бацькі аддаваць дзяцей у беларускамоўныя класы, калі яны ведаюць, што літаральна ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы, як, дарэчы, і сярэднія спецыяльныя, лічацца ў нас рускамоўнымі? Дзяржаўная палітыка ў краіне антыбеларуская, і аб гэтым трэба гаварыць адкрыта і ў поўны голас.

"Народная Воля" ўжо расказвала, які шырокі рэзананс набыў калектыўны ліст вядомых людзей кіраўніцтву Беларусі. Не трэба афіцыйнай прапагандзе каламуціць ваду: у асноўным людзі з разуменнем ставяцца да падтрымкі роднай мовы на дзяржаўным узроўні. Як заявіла пенсіянерка баба Шура са Слуцка, няхай хоць праўнук будзе мець магчымасць у беларускай дзяржаве пачуваць сябе беларусам.

Так актывісты грамадзянскай кампаніі "Наш дом" у Слуцку за кароткі час сабралі 300 подпісаў пад зваротам вучоных і пісьменнікаў у абарону беларускай мовы. Суправаджальнае пісьмо на імя прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнкі падпісала актывістка "Нашага дома" Зінаіда Цімошак.

Дарэчы, у гэтым горадзе многія лічаць, што праблема з мовай існуе толькі таму, што прэзідэнт краіны не жадае гаварыць на беларускай мове. Калі адзін падпісант пачуў, што, па словах прэзідэнта, беларуская мова не запатрабаваная людзьмі, ён вельмі здзівіўся і сказаў літаральна наступнае: "***Мае суседзі жывуць у доме з аблупленымі сценамі і нікому не скардзяцца. Дык ці значыць гэта, што яны не хочуць жыць у прыгожым доме? Хочуць, канешне. Проста наш народ выхаваны расійскім царызмам і таталітарнымі рэжымамі і не ўмее патрабаваць…"***

Нельга пагадзіцца з тымі лістамі-адпіскамі, якія атрымліваюць грамадскія актывісты на свой зварот. Чытаем: ***"Вашы лісты разгледжаны ў Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прапановы будуць па магчымасці ўлічаны зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі ў рабоце па пашырэнні выкарыстання беларускай мовы ў грамадстве".***

Што значыць — ***"па магчымасці"***? Гэта лоўкая для чыноўнага люду фармулёўка, яна нікога і ні да чога не абавязвае, затое дае магчымасць кожнаму ўвільнуць ад вырашэння пытанняў, якія пастаўлены ў звароце грамадзян, заклапочаных катастрафічным станам дзяржаўнай беларускай мовы і нацыянальнай культуры; а на гэтым жа трымаецца нацыя!

Па-другое, ***"прапановы будуць… улічаны зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі…".*** Але дзе ж гэта ў наш залыганы вертыкаллю час вы бачылі дзяржаўныя органы, зацікаўленыя ў развіцці роднай мовы? Іх няма. Яны перавяліся недзе з сярэдзіны 90-х гадоў. З тых часоў мова пад прэсінгам, тыя хто сёння ўладарыць, і не думаюць аслабляць гэты ціск. Такое, скажу адкрыта, нялюдскае стаўленне да беларускай мовы, дадзенай Богам раз і назаўсёды, не можа не абураць сумленных грамадзян. Пра гэта, дарэчы, сведчаць і новыя лісты на адрас грамадзянскай ініцыятывы "Інстытут нацыянальнай памяці" і ў Адміністрацыю прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сярод падпісантаў — паважаныя людзі: **Уладзімір Лайкоў** з Барысаўшчыны, выдатнік адукацыі, **Станіслаў Суднік** з Ліды, рэдактар газеты "Наша слова", **Анатоль Вярцінскі** і **Леанід Лeвановіч** з Мінска, пісьменнік і грамадскі дзеяч з Масквы **Аляксей Каўка**, папулярызатар гісторыі з Мінска **Анатоль Тарас**, кампазітар, спявак **Андрэй Плясанаў.** Сярод падпісантаў і сям'я рабочага **Валянціна Духовіча** з Віцебска, медык **Ларыса Куліцкая**, цырульнік **Галіна Пармон**, повар **Галіна Галіеўская**, зваршчык **Генадзь Галіеўскі**, настаўнік **Уладзімір Дарагуж**, юрыст **Зоя Сушкевіч**...

Пра клопат аб роднай мове сведчаць і нашы шматлікія сустрэчы, гутаркі з людзьмі ў розных раёнах. Таму яшчэ раз скажу: не трэба тым, хто сёння ва ўладзе, талдычыць, што народ сам адмаўляецца ад беларускай мовы. Не трэба займацца спекуляцыяй, шаноўныя! Галоўная прычына выключна ў вашай хваробе, якая характарызуецца такімі словамі, як "нігілізм" і "бяспамяцтва". Такая хвароба можа звесці наш народ у магілу.

Усе, хто паставіў подпіс пад зваротам, хто адгукнуўся на яго (а гэта сотні, тысячы паважаных людзей — пісьменнікаў, вучоных, артыстаў, урачоў, святароў, студэнтаў, рабочых, працаўнікоў вёскі), **чакаюць адказу ад кіраўніка дзяржавы,** бо да яго ж у першую чаргу звярталіся яны, бо ад яго, у рэшце рэшт, у многім залежыць, ці зоймуцца дзяржаўныя органы ратаваннем мовы тытульнай нацыі альбо будуць працягваць палітыку замоўчвання гэтай надзвычай вострай праблемы, палітыку здрадніцтва беларускаму народу.

Нядаўна нашы літаратары, удзельнікі Форуму перакладчыкаў і выдаўцоў СНД і краін Балтыі, які прайшоў у Ерэване, мелі сустрэчу з якуцкімі пісьменнікамі, дэлегацыю якіх узначальвала народны паэт Якуціі Наталля Харлámп'ева. Даведаўшыся пра стан беларускай мовы, яны былі вельмі здзіўленыя. Чым? Парадоксам. Атрымлівалася, што ў іх, якутаў, адносіны да роднай мовы лепшыя, чым у нас, беларусаў. А калі яшчэ даведаліся, што прэзідэнт слыннай Рэспублікі Беларусь пагарджае роднай мовай, можаце ўявіць іх стан душы — анямелі!

Не ўва сне, а ў рэальнасці хочацца бачыць такую сітуацыю. Вось Аляксандр Рыгоравіч сустракаецца з рабочымі і гутарыць з імі на беларускай мове… Вось ён на пасяджэнні ў НАН Беларусі і перад навуковай элітай зачытвае з нагоды нейкага юбілею прывітальнае слова па-беларуску, акадэмікі ўдзячна і дружна яму апладзіруюць… Будучы ў Гродне А.Лукашэнка не абмінае філфак універсітэта імя Янкі Купалы і дзякуе выкладчыкам за іх зварот да яго з заклікам падтрымаць беларускую мову ў цяжкі час. Прафесура філфака ў сваю чаргу расказвае кіраўніку суверэннай дзяржавы пра плён сваёй працы і дасягненні беларускіх мовазнаўцаў, беларускіх літаратараў…

Пасля гэтакіх сустрэч і гутарак Аляксандра Рыгоравіча ні ў кога не ўзнікне думкі, што ў беларускай мовы няма будучыні. Адраджэнне яе, пабытавае выкарыстанне пойдуць шпаркімі тэмпамі ў кожным куточку Беларусі. Адродзіцца прэстыж мовы — адродзіцца ва ўсім свеце слова пра яе носьбітаў, беларусаў.

Прыемна адзначыць, што дзе-нідзе паварот да роднай мовы ўжо акрэсліўся, пра што сведчаць лісты не толькі шараговых грамадзян, але і некаторых адказных асоб, аб чым гаварылася ў папярэдніх публікацыях. Як не радавацца таму, што з верасня-кастрычніка пашырыліся беларускамоўныя перадачы на нацыянальным радыё і тэлебачанні, толькі хочацца чакаць ад Белтэлерадыёкампаніі наступных крокаў.

Нельга не падтрымаць ініцыятыву грамадскіх аб'яднанняў "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" і "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны", якія выступілі з заклікам зрабіць 2009 год **Годам Беларускай Мовы**. Гэтаму ж закліку вельмі пасуюць і намеры заканадаўчых органаў — Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу дзяржавы — у наступным годзе адкарэкціраваць палажэнні Закона "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" і некаторых іншых законаў з мэтай дасягнення фактычнай роўнасці дзяржаўных моў на практыцы, як таго патрабаваў і патрабуе Канстытуцыйны суд у сваім Рашэнні №П-91/2003. Пра гэты намер паведамілі яшчэ ў чэрвені-ліпені старшыні Камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі А.П.Морава і Камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў У.М.Здановіч. Будзем спадзявацца, што адказныя асобы спраўдзяць свае словы.

Шчыра хочацца пажадаць поспеху і актывістам маладзёжнага крыла Партыі БНФ, якія пачалі рупіцца, каб сабраць у абарону дзяржаўнай беларускай мовы 50.000 подпісаў. Пазіцыя грамадскасці праяўляецца ўсё больш выразна.

Выратаванне мовы нашых продкаў, мовы Купалы і Коласа, Мележа і Караткевіча, Танка і Быкава, Барадуліна і Гілевіча, мовы ўсіх беларусаў, якіх хвалюе лёс Бацькаўшчыны, — святы абавязак кожнага з нас. І прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павінен паказаць прыклад у гэтай лёсавызначальнай справе. Вось чаму шырокая дэмакратычная грамадскасць, якая паставіла свае подпісы і падтрымала вышэйназваны зварот, чакае яго слова, яго дзеянняў.

**Васіль ЯКАВЕНКА,**
**пісьменнік, каардынатар грамадзянскай ініцыятывы "Інстытут нацыянальнай памяці".**

## *Бяднеем…*

**Сярэдні налічаны заробак у Беларусі ў лістападзе знізіўся ў параўнанні з кастрычнікам больш як на 13 тысяч рублёў.**

Нацыянальны статыстычны камітэт паведамляе, што налічаны сярэдні заробак работнікаў па краіне ў лістападзе склаў 1 млн 12 тыс. 903 рублі (у кастрычніку — 1 млн 26 тыс. 187 рублёў), рабочых і служачых — 1 млн 31 тыс. 281 рубель (у кастрычніку — 1 млн 42 тыс. 692 рублі).

## *Рэпетыцыя для гледачоў*

Выпрабавальнае запаўненне "Мінск-Арэны" запланавана на 26 снежня. Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі намеснік старшыні Мінгарвыканкама Міхаіл Ціцянкоў.

Мяркуецца, што спартыўны комплекс запоўняць 15 тысяч гледачоў. Ім раздадуць квіткі, каб правесці своеасаблівую рэпетыцыю.

Па словах Ціцянкова, гледачы павінны арыентавацца на новым мегааб'екце Мінска, які мае 62 дзверы, 34 рамкі пропуску і масу сектараў.

## *Белорусские пограничники задержали телегу с 700 кг джинсов*

В трех километрах от государственной границы с Украиной пинские пограничники задержали гужевую повозку, сообщили агентству "Интерфакс-Запад" в пресс-службе Государственного пограничного комитета.

Житель деревни Деревная перевозил в гужевой повозке... джинсы. Документы, подтверждающие легальность его приобретения, он предъявить не смог. Контрабандный груз состоял из более чем 700 килограммов джинсовых брюк. По предварительным оценкам, стоимость джинсов составляет около 38 тысяч долларов в эквиваленте.

# О Путине бедном замолвите слово…

*(Окончание. Начало на 1-й стр.)*

Показательны судьбы Е.Ростикова, бывшего собкора российской газеты "Завтра", а с ним многих журналистов, писателей, политологов, на протяжении более десяти лет дравших горло за Батьку и стеной стоявших за приоритетные отношения с Россией. Их, грубо говоря, зачистили. Кто в сторожа подался, кто в кондукторы. Я мог бы назвать фамилии не сдавших тестов на "многовекторную политику", но могу навредить людям. На смену непригодным пришли как раз те, что вякают нынче с экранов о "косноязычии Путина". Мне недавно позвонил на дом (все записано) товарищ из окружения Н.Чергинца и прохрипел в трубку: "Нарываешься..."

Что, собственно, произошло с Е. Ростиковым? Напечатал несколько нелицеприятных для здешних политиков материалов. И вся любовь. Зазвенели телефоны у А. Проханова, главного редактора газеты "Завтра". Настырно беспокоили не только белорусские товарищи, но и свои ура-патриоты. Проханов сдался. "Ты не только с Беларусью меня поссорил, — сказал он Ростикову, — но и пол-России против меня настроил... Уходи".

Насчет "пол-России" Проханов явно переборщил. "Брестской крепостью" называют Беларусь российские радикал-коммунисты ( в чужих руках морковка всегда толще) и отчасти патриоты-державники, не желающие стать системной оппозицией. Последние страстно хотят видеть на кремлевском троне если не монарха, то хотя бы под хохлому раскрашенного Пиночета.

### Ответ воздыхателю

Газета "Советская Россия", 8 октября сего года. Статья "Бесхалявный социализм", автор А. Фролов: *"...Основные впечатления (от поездки по Беларуси. — **В.Д.**) — все более углубляющиеся различия между Белоруссией и Россией практически по всем параметрам. Обе страны входят в одно Союзное государство, а движутся в разных направлениях. Белоруссия не только социалистическая, но и европейская страна по большинству социокультурных показателей — образованию, здравоохранению, социальной защите и инфраструктуре. Белоруссия все больше врастает в Европу, а Россия от нее отделяется... Разница между Путиным и Лукашенко в том, что Путин — представитель блока бюрократии и верхних слоев буржуазии (олигархов), а Лукашенко — представитель трудящихся или, как говорили в старину, представитель рабочих, крестьян и трудовой интеллигенции".* Жуткая смесь чаадаевщины, смердяковщины и квазилевой парадигмы. Даже при сильном взбалтывании она не взорвется. Пшикалка.

Мифы о какой-то особой "белорусской модели" вдрызг разбивает суровая действительность. Места среди 20 крупнейших налогоплательщиков страны (2008 г., когда всплеска гриппа не было, и финансово-экономический кризис едва просматривался) распределились следующим образом: "Беларуськалий" — 1, "Нафтан" и "Мозырьский НПЗ" — 2—3, "Белтрангаз" — 4, "Лукойл-Белоруссия" — 5, Белорусский металлургический з-д — 6, "Минск-Кристалл" — 7, "Минскэнерго" — 8, "Беларусьнефть" — 9, "Юнис Ойл" — 10, "Гомельэнерго" — 11, "Славнефть Старт" — 12, "Велком" — 13, "Мобильные ТелеСистемы" — 14, Гродненская табачная фабрика — 15, Климовичский ликероводочный завод — 16, "Белтелеком" — 17, "Табак-Инвест" — 18, "Витебскэнерго" — 19, "Гомельтранснефть" — 20.

Итак, четыре позиции за водкой и табаком. Все понятно. Гуляй, Вася! "Моя мобила", калийная соль, металлургический завод. Остальное — за энергетикой. Что будет, если Россия, ссылаясь на возникшие трудности, вместо 22 миллионов сырой нефти начнет поставлять нам 7—8 миллионов тонн?

Если социально-экономические показатели в стране упадут на 30—35 процентов и продержатся в таком состоянии месяцев 5—7, народ выйдет на улицы. Несмотря на пресловутую толерантность, почти три миллиона приватных легковушек и приличные вклады в банках. Поэтому тактика око за око в отношении России неразумна и, главное, бесполезна. Прессинговать Медведева с Путиным, тайно надеясь, видимо, выторговать дешевые российские энергоресурсы (официальные белорусские СМИ заполнены антироссийской риторикой, у военных это называется "дружественным огнем") — себе дороже. Разговор через губу является признаком слабости. Никакого отношения к достойному спору сторон не имеющий. Тот, кто думает, что Россия мечтает инкорпорировать Беларусь — умственный недоросль или таковым прикидывается, преследуя мелкотравчатые политические цели. Путать ненасытные аппетиты отдельных российских олигархов со стратегией развития России, разработанной единой командой Медведева и Путина, нельзя. Кремлю крайне важно иметь на западных рубежах дружественную и независимую страну. Впрочем, о современной геополитике, ее законах, подводных камнях и парадоксах поговорим в другой раз. А пока в самый раз о Путине бедном замолвить слово. Мы, белорусы, будем иметь с ним дело и тогда, когда А. Лукашенко уйдет на отдых.

**Вячеслав ДАШКЕВИЧ,**
**член Союза писателей Беларуси.**

## ОТ РЕДАКЦИИ

**Соглашаемся: не свойственную роль берет на себя "Народная Воля", становясь посредником между А.Лукашенко и теми, кто, обличая его "помощников", готов оказать власти достойную услугу. Но что делать? На первое место мы ставим интересы страны, государства. И если эта публикация, как и многие другие, будут этому способствовать — значит, "Народная Воля" с честью выполняет свою миссию.**

**Маленькая ремарка: но редакция никогда не согласится, чтобы какая-то "мозговая группа", обеспечивающая президента объективной, незаангажированной информацией, действовала при "Народной Воле". Газета — средство массовой информации, а не какой-то специальный аналитический центр, пусть даже очень умных людей.**

АФІЦЫЙНА

## *Праз два-тры гады знікнуць чэргі ў мінскіх паліклініках?*

**Намеснік старшыні Мінгарвыканкама Міхаіл Ціцянкоў паабяцаў, што ў бліжэйшыя два-тры гады праблема медыцынскіх кадраў у сталіцы будзе вырашана.**

— Мінскія гарадскія ўлады прынялі шэраг мер па замацаванні пасля заканчэння ВНУ студэнтаў-медыкаў, — заявіў на прэс-канферэнцыі ў Мінгарвыканкаме Міхаіл Ціцянкоў. Зараз у Мінску не хапае каля 2 тысяч медработнікаў, 500 з якіх — урачы. Але, як адзначыў чыноўнік, гарадскія ўлады прымаюць такія намаганні, што хутка праблема вырашыцца. Са слоў Ціцянкова, ужо ў 2011—2012 гадах для медыкаў у Мінску будуць пабудаваны два сучасных інтэрнаты кватэрнага тыпу. Акрамя таго, паведаміў намеснік старшыні Мінгарвыканкама, мінскія медыкі маюць сур'ёзныя даплаты, асабліва спецыялісты вузкага профілю.

Безумоўна, пад сумнеў словы Міхаіла Ціцянкова ніхто не ставіць. Больш за тое, ахвотна верыцца, што ў Мінску выпускнікі-медыкі застаюцца з большым задавальненнем, чым едуць на працу ў раённыя бальніцы альбо сельскія амбулаторыі. Але ж ці ідуць яны працаваць у першаснае звяно, у паліклінікі, дзе дэфіцыт урачэбных кадраў проста катастрафічны? У свой час галоўны ўрач мінскай паліклінікі №34 Дзмітрый Шаўцоў у інтэрв'ю "Народнай Волі" так патлумачыў праблему чэргаў у паліклініцы, на якую скардзіліся нашыя чытачы:

— У гэтай праблемы ёсць некалькі аспектаў. Не ўсе маладыя спецыялісты хочуць заставацца працаваць у паліклініцы. Нам кожны год размяркоўваюць з медыцынскіх ВНУ маладых спецыялістаў. Нехта застаецца працаваць, нехта сыходзіць, напрыклад, у прыватныя медцэнтры. "Паліклінічны" хлеб вельмі цяжкі. Хоць і заробкі ва ўрачоў крыху павялічыліся, і сёння з усімі даплатамі тэрапеўт можа зарабіць 1.200.000—1.300.000, але маладыя часцяком сыходзяць туды, дзе плацяць больш...

**Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.**

## *Плата за ацяпленне мяняецца…*

Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі прагназуе павелічэнне платы за ацяпленне ў снежні ў параўнанні з лістападам прыкладна на 50%. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік міністра Сяргей Сушко.

Былі праведзены разлікі расходу цеплавой энергіі, патлумачыў ён. У лістападзе пры сярэднямесячнай тэмпературы плюс 3,5 градуса на ацяпленне 1 кв. метра жылой плошчы ішло 0,00142 Гкал. У першай дэкадзе снежня сярэдняя тэмпература склалася на ўзроўні плюс 1,8 градуса, у другой — мінус 11,5, прагнозная сярэдняя тэмпература на трэцюю дэкаду — мінус 4 градусы. *"У снежні сярэдняя тэмпература, паводле нашых прагнозаў, складзе мінус 4,5 градуса, а разліковы расход цеплавой энергіі на ацяпленне аднаго квадратнага метра — 0, 00215 Гкал",* — адзначыў Сушко.

*"Калі ў лістападзе плата за ацяпленне складала для стандартнай двухпакаёвай кватэры ў 48 кв. метраў 29.620 рублёў, то, паводле нашых прагнозаў, у снежні плата павялічыцца прыкладна на 15 тыс. і складзе амаль 44,8 тыс. рублёў для дамоў, якія забяспечаны групавымі прыладамі ўліку цяпла",* — сказаў намеснік міністра.

**Андрэй КАЖАМЯКІН,**
**БелаПАН.**

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

# Сяргей Калякін выйграў у казіно каля 100 тысяч долараў, а Анатоль Лябедзька хоча паспаборнічаць с беларускім кіраўніком на гарналыжных схілах

*На гэтым тыдні прайшла онлайн-канферэнцыя з удзелам лідэраў Аб'яднаных дэмакратычных сіл Анатоля ЛЯБЕДЗЬКІ, Анатоля ЛЯЎКОВІЧА, Мечыслава ГРЫБА, Сяргея КАЛЯКІНА і Вінцука ВЯЧОРКІ. Прапануем вашай увазе самыя вострыя і цікавыя пытанні і адказы на іх...*

**— Хто з вас першым наважыцца прызнаць рэаліі і сысці на палітычную пенсію?**

**Калякін:** — Мне яшчэ рана на пенсію. Я буду займацца палітычнай дзейнасцю незалежна ад таго, якія ролі буду займаць у партыі. Гэта мая грамадзянская пазіцыя.

**Лябедзька**: — Мой кантракт з партыяй грунтуецца на дэмакратычнай працэдуры. Калі мае калегі не палічаць, што я эфектыўны на гэтай пасадзе, тады буду займацца іншай дзейнасцю.

**Грыб:** — Я ўжо даўно на пенсіі па ўзросце. Але палітычная дзейнасць узросту не мае. Мяркую, што буду займацца да той пары, пакуль хопіць майго здароўя.

**Вячорка:** — Я ведаю, што такое змагацца за незалежную Беларусь. Тыя, хто хацеў бы прымусіць мяне маўчаць, не дачакаюцца.

**— Вы нярэдка крытыкуеце еўрапейскія структуры за тое, што яны ідуць насустрач сённяшняму рэжыму. А можа, гэта проста вы не ў стане што-небудзь зрабіць і еўраструктуры проста не хочуць траціць грошы на няўдачнікаў?**




**Вячорка:** — Пытанне не ў грашах. Аб'яднаная Еўропа рызыкуе страціць у вачах народа веру ў еўрапейскую будучыню Беларусі.

**Калякін:** — Нярэдка прадстаўнікі еўраструктур размаўляюць з уладай нашай мовай і даносяць нашы ідэі. Але ўлада не хоча чуць гэтыя словы і нічога не робіць. У еўрапейцаў прысутнічае залішні аптымізм.

**Лябедзька**: — Апошняя выбарчая кампанія ў Палату прадстаўнікоў. Людзі з дэмакратычных сіл не атрымалі ніводнай капейкі ад еўрапейскіх структур. АДС прапаноўваюць формулу: крэдыты ў абмен на свабодныя выбары. Не на падтрыманне партый і структур, а на свабодныя выбары.

**Грыб:** — Я супраць усякай ізаляцыі. За кантакты паміж ЕС і ўладай. Але дэ-факта кантакты расшырыліся да ўлады і звузіліся да апазіцыі.

**— У гэтым годзе Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы не правялі ніводнай буйнамаштабнай акцыі. З чым вы гэта звязваеце: людзі расчараваліся ў вашых ідэях, расчараваліся ў магчымасці перамен ці проста баяцца?**

**Лябедзька**: — Падпішыцеся на газету "Народная Воля", "Товарищ", "Свободные новости". 350.000 экземпляраў было выдадзена з антыкрызіснымі прапановамі АДС. Колькі было выхадаў на заводскія прахадныя. Гэта вялізны пласт працы. Можа, людзі не ведаюць пра гэта альбо не хочуць ведаць.

**— У малых гарадах (не кажучы пра вёскі) пра вас практычна нічога не ведаюць, акрамя агульнага слова "апазіцыя", і то ў негатыве (зразумела, што з падачы "чэсных" СМІ). Чаму так? Інтэрнет не ў кожным доме. Народ не задаволены інтуітыўна, але ніхто не прапаноўвае выразнай альтэрнатывы.**

**Калякін:** — Гэта праблема. Але мы стараемся яе вырашаць. А тыя, у каго ёсць інтэрнет, глядзіце сайты. Звяртайцеся таксама ў офісы партый, прасіце дасылаць газеты. Вы можаце самі паўдзельнічаць у распаўсюджванні інфармацыі. Мы будзем толькі ўдзячны.

**— (Пытанне Сяргею Калякіну). Неяк па БТ паказалі сюжэт, дзе вы гуляеце ў аўтаматы. Не пытаюся, з якой рэгулярнасцю вы заходзіце ў гэтыя ўстановы, але проста цікава, як азартнаму чалавеку, які ў вас у жыцці быў максімальны выйгрыш і пройгрыш у барацьбе з казіно ці аўтаматамі?**

**Калякін:** — Я лічу, што Беларусь павінна прывесці іграві бізнес у парадак. Дзяржава проста абірае людзей, заманьвае іх у казіно і залы аўтаматаў. Гэта лахатрон, які "набівае кішэні" на звычайных грамадзянах. Аб гэтым я і сказаў тады БТ. Але нічога такога ў сюжэце яны не паказалі. А самы вялікі мой выйгрыш — тры мільёны расійскіх рублёў. І я ніколі не прайграю.

**— Як вы ацэньваеце сённяшнюю сітуацыю з незалежнымі СМІ ў Беларусі?**

**Вячорка:** — Падрыхтавана заканадаўчае рэгуляванне інтэрнэт-прасторы, міністрам інфармацыі прызначаны Праляскоўскі. Дзяржава рыхтуецца да прэзідэнцкага выкліку. І яна паказвае гэтым, што баіцца.

**Калякін:** — Вельмі дрэнны стан друкаваных СМІ. А патрэбна проста захоўваць дзеючую Канстытуцыю: даць роўныя ўмовы дзяржаўным і недзяржаўным СМІ. І спыніць адміністрацыйны ціск...

**Лябедзька:** — Я распаўсюджваў "Новы час", "Народную Волю", "Свободные новости" ў 2009 годзе. І спадзяюся, што ў 2010 у мяне будзе такая магчымасць. Чым менш свабоды для СМІ, тым менш магчымасцяў для нас. У нас было добрае супрацоўніцтва са СМІ ў гэтым годзе. 350 000 экземпляраў газет выйшлі. Можна падпісвацца на газеты, ёсць і канал "Белсат".

**Грыб:** — Наогул незалежных СМІ няма. Адны залежаць ад улады, другія — ад грошай. Я за роўныя ўмовы для СМІ. А сёння яны вымушаны мець шмат розных цэнзур. І там ужо няма чаго чытаць, усё выхалашчана, бо яны баяцца судоў. Улада, разумеючы значнасць СМІ, не пойдзе на іх вызваленне.

**Ляўковіч:** — Сітуацыя са СМІ абазначана. У наступным годзе яна будзе ўскладняцца. Гэта будзе няпросты год. І крызіс, і выбары. Наперадзе няпростыя кампаніі па выбарах у мясцовыя Саветы і прэзідэнцкая. Год будзе няпросты для ўлады і напружаны для апазіцыі.

**— Якія асабістыя мэты вы ставіце на наступны год?**

**Грыб:** — Будзе складаны год. Вялікага аптымізму няма. Але хацелася б прымаць больш актыўны ўдзел у палітычным жыцці краіны.

**Лябедзька:** — Абагнаць Лукашэнку, з'ехаўшы з гары. АДС магла б выставіць каманду. Хто выйграе, той і прапаноўвае правілы для выбарчай кампаніі. Калі сур'ёзна, то хацеў бы, каб працэнтаў 80 людзей ведалі нашу антыкрызісную платформу, ёй давяралі.

**Калякін:** — Патрэбна амбіцыёзныя мэты ставіць. Быць жывым, здаровым, па магчымасці, на свабодзе. Працягваць палітычную дзейнасць.

**Вячорка:** — Буду рабіць усё для таго, каб у 2010 годзе расчараванні змяніліся святлом у канцы тунеля.

**Падрыхтаваў**
**Алесь СВЯТЛАНІЧ.**

# Амаль 700 мільёнаў долараў прыйшлі на беларускі рахунак

**Савет дырэктараў Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) завяршыў трэці агляд праграмы стэнд-бай і прыняў рашэнне аб выдзяленні Беларусі чарговага траншу крэдыту на 688 мільёнаў долараў.**

У выніку агульная сума сродкаў, выдзеленых фондам для Беларусі ў межах стабілізацыйнай праграмы, дасягнула каля 2,88 мільярда долараў.

У распаўсюджаным МВФ паведамленні намеснік дырэктара-распарадчыка МВФ Такатошы Като заявіў, што беларуская эканоміка пачынае выходзіць з крызісу. *"Аб'ём экспарту стабілізаваўся, зніжэнне абменнага курсу рубля садзейнічае павышэнню канкурэнтаздольнасці і даверу да нацыянальнай валюты сярод насельніцтва",* — зазначае адзін з кіраўнікоў МВФ.

http://www.nv-online.info
24—28 СНЕЖНЯ 2009 г.

# Провал

*Важнейшая конференция года в Копенгагене по важнейшей мировой проблеме сохранения климата провалена. Почему?*




Вот вопрос, который волнует политиков, комментаторов, граждан... И будет еще долго волновать.

Ведущие СМИ западных стран с разочарованием восприняли Копенгагенскую конференцию по проблемам климата, которая завершилась принятием "необязательной" декларации. Она содержит лишь следующие условия: температура воздуха на планете к 2050 году должна повыситься не более чем на 2 градуса, а к 2012 году мировое сообщество должно выделить 30 млрд долларов на сдерживание климатических изменений. Механизм реализации этих решений не прописан.

А ведь ожидалось, что в Копенгагене лидеры в крайнем случае примут хотя бы решение: в течение 2010 года доработать и заключить настоящий международный договор о климатических изменениях. Однако в итоговом документе эта задача не поставлена, а детальная проработка подобного договора, видимо, потребует вести переговоры еще несколько месяцев, если не лет.

В ходе 12-дневной дискуссии не смогли найти общего языка представители развитых и развивающихся стран. В частности, в ответ на призыв развитых стран принять меры к ограничению роста среднегодовых температур двумя градусами по Цельсию развивающиеся высказались за более жесткий ограничитель. Они считают, что потепление климата надо ограничить полутора градусами.

Однако главный спор зашел о том, должны ли вообще ограничивать выбросы развивающиеся страны и, если должны, кто должен оплатить эти усилия. Значительная часть развивающихся стран высказалась за то, чтобы сохранить в силе завершающий свое действие в 2012 году Киотский протокол, не устанавливающий для них ограничений по выбросам. Кроме того, развивающиеся страны требовали от развитых значительной по размерам помощи в деле внедрения экологически чистых и энергосберегающих технологий.

В ходе дискуссий было предложено восемь проектов итогового заявления, но ни один из них не прошел. В этих условиях президент США Барак Обама постарался найти общий язык с делегацией КНР. Обама и госсекретарь США Хиллари Клинтон неоднократно вели беседы с возглавляющим китайскую делегацию Вэнь Цзябао, а американские чиновники более низкого ранга работали с членами китайской делегации.

Наконец Вэнь Цзябао пригласил Обаму на встречу, на которой присутствовали также премьер-министр Индии Манмохан Сингх и лидеры Бразилии и ЮАР. (Это была, можно считать, группа БРИК, но с ЮАР вместо России.) Иначе говоря, собрались лидеры наиболее влиятельных развивающихся государств. Обама представил им проект итоговой декларации, с которым они согласились.

По существу, этот трехстраничный документ сводится к нескольким пунктам. Во-первых, предлагается принять меры к недопущению повышения земной температуры более чем на два градуса по Цельсию. Во-вторых, подтверждается готовность значительно снизить с этой целью глобальные выбросы парниковых газов. И, в-третьих, говорится о необходимости оказания развитыми странами помощи развивающимся странам до 2012 года в размере 10 млрд долларов в год и в дальнейшем, до 2020 года, - по 100 млрд долларов в год. Развивающиеся страны рассчитывали получить гораздо больше. В текст включена также фраза о необходимости мониторинга усилий по ограничению и сокращению выбросов развивающимися странами. Как известно, ранее этот вопрос являлся предметом разногласий между американской и китайской делегациями - Пекин никак не соглашался на внешний контроль за его действиями в экологической области. Однако и этот проект многие не поддержали.Не помогли никакие убеждения.

"Мы несем моральные обязательства по отношению к будущим поколениям. Ни одна нация, богатая или бедная, не может избежать участия в этом процессе", — эмоционально убеждал собравшихся хозяин саммита, датский премьер-министр Ларс Расмуссен. "Опасность реальна, это не фикция. Изменение климата ведет к непредсказуемым рискам для планеты. Мы прилетели сюда не говорить, а действовать", — поддержал его президент США Барак Обама.

Лидеры других стран выступали не менее эмоционально, но говорили совсем о другом. "Я победил на президентских выборах 2003 года, обещая каждому бразильцу завтрак, обед и ужин. Для Европы надежды на трехразовое питание в далеком прошлом, но для Африки и Латинской Америки — это будущее", — заявил с трибуны бразильский лидер Луис Лулу да Силва и сорвал аплодисменты в зале. "У нас было столетие без экономического роста, и сейчас, когда он есть, мы не хотим возвращаться назад. Мы хотим сохранить планету, но хотим сделать это без жертв", — добавил он.

Пожалуй, самый неожиданный взгляд на экологические проблемы продемонстрировал президент Колумбии Альваро Урибе. Он долго рассказывал с трибуны о том, как производители кокаина в его стране вырубают девственные леса под поля для наркотиков. Лидер Венесуэлы Уго Чавес привычно воспользовался международной трибуной для обличения империалистической политики США. Он обратил внимание на то, что в отличие от других лидеров Барак Обама после выступления не вернулся в зал, а вышел через заднюю дверь на сцене. "Вот так они пытаются управлять всем миром — через заднюю дверь", — возмутился он.

Запад оказался у позорного столба, при этом не без собственного участия, обещая всем без разбору "развивающимся странам" финансовую помощь. Так считает обозреватель германской Die Welt Рихард Херцингер.

Когда Запад провозглашает тему защиты климата как преобладающую над всеми проблемами человечества, он сам дает в руки диктаторам уникальный инструмент пропаганды. Такие требования, как соблюдение прав человека, автократы парируют указанием на то, что Запад сам не выполняет элементарные обязательства перед человечеством по сокращению эмиссии. В конце концов, тычут они пальцем, превосходство в технологиях Запад приобрел за счет разрушения мирового климата, от которого страдает все остальное человечество. Тут и Китай, неожиданно позиционируя себя как развивающуюу страну, заявляет о том, что не собирается приспосабливаться к чуждым для него идеалам защиты климата, добавляет автор.

Херцингер приходит к выводу, что именно в вопросе климатических изменений не должны быть затерты фундаментальные различия между открытыми обществами и диктатурами. Иллюзорные представления о мире как о "большой и дружной семье" не принесут ничего хорошего ни человечеству, ни тем более делу защиты климата.

Причина провала и в том, что существует пропасть между богатыми и бедными странами. Богатые страны смотрят в далекое будущее человечества. Бедные озабочены ускорением своего развития здесь и сейчас, а ключевое его условие — массовое использование полезных ископаемых, которые коптят небо.

Важный фактор, как указывает швейцарская Le Temps, — дробление политической власти: ООН сумела довести до сознания руководителей государств проблемы климата и организовать конференцию, но перейти от дискуссий к действиям оказалось слишком сложно, так как наивно требовать от 200 участников принять общее решение по столь сложному вопросу. Для противостояния глобальным вызовам международному сообществу сегодня необходимо найти новую форму представительства, которая отражала бы интересы всего человечества.

Некоторые группы по охране окружающей среды, включая Greenpeace, обвиняют Евросоюз в том, что ему не удалось заставить Китай и США согласиться на более жесткий и обязательный к исполнению договор. Greenpeace призывает политиков проявить решимость и достичь реального соглашения в будущем году.

**Андрей ПЕТРОВ.**

## Сербия подала заявку в ЕС

Сербия подала официальную заявку на вступление в Европейский Союз, сообщает AFP. Ее президент Сербии Борис Тадич вручил шведскому премьер-министру Йону Фредрику Райнфельдту, председательствующему в ЕС в настоящее время. Как ожидается, Сербия сможет вступить в состав Евросоюза в 2014—2018 годах после проведения ряда реформ для соответствия с требованиями ЕС.

## Не успевают

Вопреки первоначальным планам, США и Россия не успевают заключить новый договор о сокращении стратегических наступательных вооружений (СНВ) до конца 2009 года. Как сообщил в Вашингтоне представитель Госдепартамента США Филипп Кроули, консультации решено возобновить в Женеве в середине января. Он подчеркнул, что целью сторон остается "скорейшее заключение основательного договора". Срок действия предыдущего договора — СНВ-1, подписанного еще в 1991 году, истек 5 декабря.

## Британский принц Уильям переночевал на улице

Он попытался ощутить себя в шкуре бомжа, проведя ночь при минусовой температуре на лондонских улицах. Компанию ему составили личный секретарь и глава благотворительной организации Centrepoint Сейи Обакин. Они спали на картонных коробках возле лондонского моста Blackfriars, передает Sky News.

После ночи, проведенной на улицах, принц Уильям отправился в приют организации, чтобы отметить ее сороковую годовщину. Он призвал решить проблему бездомного проживания в течение 10 лет.

## Арестовано имущество бывшего премьера

Принадлежащее бывшему премьер-министру Латвии Валдису Биркавсу имущество арестовано в связи с его многомиллионными долгами, сообщает портал Delfi. Арест наложен на банковские счета Биркавса, его недвижимость, а также на принадлежащие ему пакеты акций крупных компаний.

Издание отмечает, что долг возник после того, как Биркавс взял кредит в государственном банке и купил четыре участка земли. Сумма кредита составила 2,24 миллиона латвийских латов. Однако позже цены на землю упали, и продать участки удалось только за 160 тысяч латов.

**КАК ЭТО БЫЛО...**

*Татьяна Дьяченко, дочь Ельцина:*

# «Если бы не Чубайс, Россией мог управлять Лукашенко»

**Татьяна Дьяченко решила завести собственный блог, чтобы напрямую отвечать на вопросы российских граждан о периоде правления Бориса Ельцина. В одной из первых записей она рассказала случай, когда суверенитет России спасла внимательность Анатолия Чубайса, сообщает "Деловой Петербург".**

В апреле 1996 года Россия и Беларусь подписали договор о создании Сообщества двух стран. Его цель — создание единого федеративного государства. Исполнительный комитет нового образования должен был подготовить Устав союзного государства: *"Как обычно бывает в таких случаях, документ пошел на согласование в министерства и ведомства, получил визы российского МИД и министерства по делам СНГ... и вот уже в СМИ объявляется, что 2 апреля два президента должны подписать новый союзный договор".*

"Ночью 28 марта Анатолий Чубайс, первый-вице-премьер правительства, звонит в Кремль главе администрации Валентину Юмашеву и говорит: "Валя, а ты в курсе, что уже через неделю у нас возникнет новое государство?" "В каком смысле?" — отвечает Юмашев...

В ходе разговора выясняется, что в документе, который только сейчас попал на стол Чубайсу для визирования, есть положения, которые по сути уничтожают суверенитет России и передают властные полномочия новым органам союза — Высшему совету и Парламентскому собранию. Например, в одной из статей было сказано: "Решения Высшего совета обязательны для органов Союза и для органов исполнительной власти стран-участников", — пишет в своем блоге Татьяна Дьяченко.

Предложенный Устав был подготовлен председателем комитета Думы по делам СНГ коммунистом Тихоновым и замминистра белорусского МИД Антоновичем. Оказалось, что в документ сильно никто не вникал: его визировали и отправляли выше. И даже в Кремле помощник президента по международным вопросам написал записку Ельцину о том, что Устав необходимо подписывать, поскольку он *"полностью соответствует стратегическим интересам России".*

"Юмашев утром доложил президенту ситуацию. Папа в бешенстве... Внутри правительства и администрации президента раскол. Вице-премьер Серов и помощник президента Рюриков, два главных действующих лица, отвечающих за работу с СНГ, настаивают на подписании этого документа. Их аргументация: Устав — это шаг к созданию нового Союза...

Вопрос: что мы будем делать, когда Александр Лукашенко, будучи руководителем Союза и возглавляя Высший совет, начнет заниматься экономикой России, как он это делает у себя дома, или войну Западу объявит? На это говорилось: ну, мы же этого не позволим. Только, если Устав давал такие возможности, не позволить уже было бы невозможно", — поясняет дочь президента и рассказывает, как Б.Ельцину все же удалось разблокировать, можно сказать, трагическую для России ситуацию.

## Самолет разломился, теплоход перевернулся

Самолет авиакомпании American Airlines потерпел крушение в аэропорту столицы Ямайки города Кингстон. Лайнер, прилетевший из Майами, выехал за пределы взлетно-посадочной полосы и разрушился на две части. Отправной точкой маршрута самолета был Вашингтон.

На западе Англии, в графстве Корнуолл, сегодня ночью перевернулся автобус. В результате ДТП получили травмы 48 человек. ДТП произошло из-за образовавшейся гололедицы на дороге, передает ИТАР-ТАСС.

А на Амазонке, в бразильском штате Пара, теплоход налетел на песчаную отмель и опрокинулся. Семь человек погибли, трое пропали без вести. На борту судна, загруженного до предела, находилось свыше ста пассажиров и членов экипажа.

## Хиллари Клинтон «встретилась» с Санта-Клаусом

Представитель Госдепартамента США заявил, что госсекретарь Хиллари Клинтон побывала на Северном полюсе, где провела "важную двухстороннюю встречу", имея в виду, что госсекретарь посетила Санта-Клауса.

Среди "заказов" к Рождеству г-жи Клинтон были: открытые и подотчетные правительства, переговоры по Ближнему Востоку, сокращение ядерных арсеналов, уважение прав человека и достаточное количество продовольствия для людей во всем мире.



**Перадднавагодні рынак у Таліне.**

## Судья постановил — отрезать уши

Суд в пакистанском городе Лахор приговорил братьев Шера Мохаммада и Аманата к пожизненному заключению. Судья постановил также отрезать обвиненным уши и вырвать ноздри.

Братья признаны виновными в том, что в сентябре этого года похитили свою двадцатилетнюю двоюродную сестру Фазилат Биби. Когда молодая женщина отказалась выйти за одного из них замуж, они надругались над ней. "Ей затянули на шее веревку, а потом отрезали нос и уши", — сказал прокурор Эхтишам Кадир в интервью Би-Би-Си. По его мнению, вынесенный приговор соответствует исламскому принципу "око за око".

## В тюрьму за то,что съел тигра

Китайский крестьянин проведет 12 лет в тюрьме за то, что съел тигра редкой породы.

Кан Ваньнянь, проживающий в одной из южных провинций Китая, говорит, что в феврале этого года просто пошел на рыбалку, по дороге повстречал тигра и был вынужден убить животное в целях самообороны.

# Пираты Сомали

*Кто они?*



*Общественность в последнее время взбудоражена темой морского пиратства немногим меньше, чем футболом или "Евровидением". И почему-то пиратство вызывает у большинства удивление. XXI век, считают многие, несовместим с этим явлением. А почему никто не удивляется тому, что XXI век совместим с обыкновенными преступниками, бандитизмом и хулиганством на улицах? Пиратство — это морская преступность.*

*Почему именно в Сомали пиратство получило развитие и в чем его уникальность? Эту тему раскрывает Михаил Войтенко, главный редактор сетевого издания "**Морской бюллетень — Совфрахт**", в статье, подготовленной для РИА "Новости". Она представляет интерес и для наших читателей. Публикуем фрагменты из нее.*

В том, что в стране вот уже скоро 20 лет как нет никакой власти и главным источником пропитания для населения является гуманитарное продовольствие от ООН. В том также, что географически страна расположена вдоль одной из главных водных артерий мира, Аденского залива. И наконец в том, что благодаря столь выгодному положению и анархии в стране Сомали стала, пожалуй, единственным местом в мире, куда можно привести захваченное судно и держать его сколь угодно долго, пока не будет выплачен выкуп. Нигде больше в мире нельзя захватывать огромные суда в таком большом количестве и держать их в бухтах вдоль побережья до получения выкупа. В год Аденским заливом проходит до 20 тысяч судов, в сутки — до 250-ти.

Поначалу сомалийское пиратство держалось каких-то рамок, не "наглело". Но в 2009 году, а точнее в весенне-летний период, сомалийское пиратство сделало качественный скачок в развитии. После громких "успехов" и отладки новой схемы получения выкупа (непосредственно на борт захваченного судна в руки пиратам, а не через посредников в других странах) пиратство стало повальным. В настоящее время, уверен, пираты полностью вышли из-под чьего бы ни было контроля и действуют совершенно самостоятельно и стихийно. Ни с кем они не связаны, разве что гнилыми нитями коррупции и подкупа. Никто ими не заправляет, и с мировым кризисом они также не связаны, они про него вряд ли и слышали.

Сегодня в Сомали несколько банд общей численностью давно за тысячу человек, но они быстро увеличиваются. Растет и количество новых банд. В этом году было захвачено более 30 судов, из них часть рыболовные, за которые больше нескольких десятков от силы сотен тысяч долларов пираты никогда не выручали.

Средний размер выкупа за последние 4 месяца составлял примерно 1,5—1,7 миллиона. То есть в этом году пиратский бизнес принес в страну не менее 40 миллионов долларов наличными. Для нищей Сомали, где 10 долларов — это целое состояние, эти миллионы кажутся фантастическим богатством.

Основной базой можно смело назвать Эйл, городок на побережье Африканского Рога со стороны Индийского океана. Там вовсю идет веселая пиратская жизнь, процветают торговцы дорогими автомобилями, строители коттеджей и родители красивых девушек — когда им удобно, пираты вспоминают, что они мусульмане, и свадьбы идут беспрерывной чередой.

Сомалийский юноша, избравший в жизни "правильную" дорогу пиратства, уверенно идет по улицам Эйл с карманами, набитыми долларами, и ртом, набитым листьями наркотического растения хат — и редко какая девушка устоит перед такими чарами. Дети днем ходят в школу, а вечером играют в футбол и пиратов — невиданное дело для большей части Сомали, охваченной хаосом, анархией и то вяло, то активно текущей войной всех против всех.

Такая же картина расцвета и "мирного труда" наблюдается и в других основных пиратских гнездах, вдоль побережья Сомали со стороны Индийского океана и Аденского залива. Пиратство, как видим, чем дальше, тем больше становится одной из важнейших экономических и социальных составляющих в жизни страны и народа.

Как бороться с пиратами? Может, не платить им выкуп? Расстреляют пару экипажей, да и успокоятся? Для тех, кто хоть немного в теме, очевидны полнейшие несостоятельность такой позиции применительно к пиратству, тем более международному, и постоянному захвату судов.

Во-первых, страны не смогут так уж жестко пресекать все торги и попытки передать пиратам выкуп, и судовладелец всегда найдет способ перегнать деньги, обналичить их и доставить затем в нужное место.

Во-вторых, почти каждое захваченное судно — это мешанина из флага, владельца, оператора, крюинга и кучи гражданств членов экипажа. Какой-либо конкретной ответственной страны нет — ни за то, чтобы пресечь выкуп, ни за то, чтобы помочь спасти людей и судно.

В-третьих, суда будут похищать все равно. Как рачительные хозяева, пираты свезут моряков на берег и будут торговать ими поштучно. 10—20 тысяч за голову — это тоже деньги. Родственники мьянмарцев или филиппинцев такие деньги, может, и не соберут, а вот те же россияне или украинцы, не говоря про западноевропейцев, вытянут.

Есть и другие идеи — по силовому освобождению захваченных судов. Этот номер также не пройдет по двум главным причинам. Первая — силовое освобождение гарантирует гибель части или даже всего экипажа. Вторая —крайне мало судов, где и флаг, и владелец, и экипаж относятся к одной стране. Большинство — смесь. Возникает законный вопрос, какое именно государство возьмет на себя ответственность за силовой захват, и как к этому отнесутся другие государства.

Получается, что никаких механизмов решения проблем такого рода нет вообще. Ни у Международной морской организации, ни у ООН, ни у ЕС, ни у отдельно взятого государства. Самое неприятное из сомалийского опыта — это даже не отказ в помощи со стороны данного государства или сообщества стран в непредвиденной ситуации, а отсутствие у них технологии решения нестандартных проблем и желания как-то на эти проблемы реагировать.

**ХОББИ**

## Посетил 194 государства

**Индийский бизнесмен поставил необычный рекорд, объездив почти все страны мира, а точнее 194 государства за неполные семь лет.**

55-летний Каши Самаддар потратил на свое уникальное путешествие 6 полных лет жизни, а также 10 месяцев и 7 дней. Бюджет такого беспрецедентного тура достиг 350 тысяч фунтов стерлингов (почти 600 тысяч долларов), пишет газета The Telegraph.

Естественно, что жесткий временной лимит "кругосветки" не давал путешественнику изучить каждую из стран в полной мере. Внушительный альбом с фотографиями содержит лишь однотипные снимки, где Самаддар позирует на фоне вестибюлей гостиниц или баров.

Началось это фантастическое турне в июле 2002 года, когда Самаддар прибыл в Голландию. А закончил он свою миссию в мае 2009 года в Косово. По словам самого путешественника, самую большую опасность он испытал в Афганистане, Сомали и Суринаме. "Гостиница в Кабуле, где я остановился, была взорвана через час после моего ухода", -- рассказал индиец.

В Восточном Тиморе Самаддар три дня не мог добыть никакой пищи. В итоге изможденный турист заплатил местному мальчику несколько сотен долларов за пучок бананов. На острове Науру, затерянном в Тихом океане, авиарейс откладывался 8 раз. Из-за этого отчаянный путешественник застрял там на долгие полтора месяца.

Сейчас Каши Самаддар живет в Дубае. Он намерен использовать накопленный бесценный опыт, помогая другим туристам достичь неизведанного и набраться впечатлений. Для этого коммерсант создал организацию под названием Travel, Tourism and Peace Initiative. Она будет объединять только матерых туристов, которые объездили не менее 100 стран. Эти люди будут помогать другим путешественникам дельными советами, исходя из своего опыта.

*Вячаслаў ДУБІНКА*

# 42 гады ляснога палону

*(Заканчэнне. Пачатак у №№199—200.)*



## Не прадалі бастынцы земляка

Сотні людзей ведалі, што Іван, Бушылаў сын, "палкоўнік" хаваецца ад "злыдняў, што пры ўладзе". І берaглі гэтую таямніцу. І не толькі маўчалі, але і дапамагалі лясному бадзягу як маглі. Надыбае каторы Пашу, пляменніка Івана і, азірнуўшыся, ціха скажа:

— Дзядзьку перакажы, каб у Бастынь тыдзень-паўтара носа не казаў, там міліцыянты з салдатамі самагон жлукцяць, а ў салдат пагоны сам ведаеш якія. І вось, хлопчык, перадай дзядзьку Івану, — чалавек добрай душы працягвае Пашу анучку з кавалкам сала, торбачку з махоркай, паўбуханкі хлеба.

*...З хлебам стала цяжка, хадзіў па палёх, збіраў каласкі, меў нешта падобнае да крупаў, абухом сякеры на пяньку зерне раздушваў.*

*...Кароўкі на выпасе бачыў, але ў мяне не ўзнікла нават думкі падкрасціся да каторай і падаіць малачка ў сваю шапку-непрамакайку.*

*...Нарыхтоўваў сена дзеду Барысу, Паўлу — швагеру, маці і Альжбеце з Леванцінай, адзінокім старым, якія гаравалі на дальнім хутары.*

*...Рабіў калоды для пчол. Спілаваў трухлявую сасонку, год падсохне, выпетрае з яе нядобры дух — і можна пчол заманьваць. І з лазы пчала добра бярэ, але калі з'явяцца коткі.*

*...Вясной і паветра ў лесе гаючае, лекавае. Калі цвіце сасна, на душы свята. Зграбеш у даланю жоўтага пылку і ў рот, і ў рот. Моц ад гэтага пачастунку адразу адчувалася: за зіму ж ад голаду нацярпеўся, знядужаў, схуднеў, хадзіў па вясне, як п'яны.*

А былі ж у Бастыні і злыдні, якія ўладзе надта прыслужыць хацелі, прагіналіся, але іх нешта трымала. Не данеслі. Дзіўная вясковая тайна. На вуха адной па сакрэце шапяні, а тая, пабажыўшыся, што — анікому, другой ляпне па сакрэце, слухай, што ўчора было. Мне адна кабета апавядала:

— Іван Бушыла за столькі гадоў свайго хавання ў лесе людзям не зрабіў анічога злога. У чужую борць не залез, забытую сярод кустоўя пастуховую торбачку абміне, нават скібкай хлеба не пажывіцца.

А другая цётачка з Бастыні ўзрушана скажа:

— Іване не злодзей, не рабаўнік, цюцькі вясковага не пакрыўдзіў! А вось знайшліся злыдні, нядобрыя людзі — Іванавыя борці збэрсалі, скінулі з дуба, пчолак агнём выкурвалі, мёд крадучы. У каго красці надумалі, Бога пабойцеся.

А другая па сакрэце шапяне на вуха, каб і суседка не пачула:

— Іван жа, Бушыла, каторы палкоўнік, ноччу прывёў маю Марковачку, пярэстачка ў лесе згубілася. Да майго хлява прывёў, але ж аніводзін цюцька нават голасу не падаў. Палкоўнік сабак прываблівае, сакрэты свае мае.

— *...За лета насушыў грыбоў, назбіраў ягад, меў дзве лісіныя шкуры. На станцыі ў Люшчы дзед Барыс Брадніцкі збыў, набыў "радыёшаптун" "Акіян" для мяне. Увесь тыдзень свяціўся радасцю.*

У кожнага бастынца знойдзецца свая адметная прыгадка пра Івана. Цяпер жа цяжка раскласці па палічках усе таямніцы і сакрэты. Каб жа ведаць, каторы з іх праўдзівы, а каторы...

У маім нататніку занатавана шмат гісторый і розных прыгадак пра Бушылу, іх жа за 42 гады ў бастынцаў набралася шмат, а якая ж самая праўдзівая? Адзін не дачуў, другі ад сябе дадумаў, а трэці ўсё перайначыў, і новая гісторыя пайшла гуляць па наваколлі, далятае да "райчэка".

## Мікіта ракеты кляпае, як каўбасы

Абрыдла сядзець, як воўк, у лясной пустэчы, рашыўся Іван на ўчынак, якому і сам дзівіўся. Пагаліўся як след, ватоўку ачысціў ад балотнай твані і, калі добра сцямнела, рушыў да чыгуначнага вакзала ў Лунінцы. Далучыўся да купкі вясковых дзецюкоў з мяхамі і з кашамі ў руках. У пачакальні зашыўся ў куток, нацягнуў шапку на вочы. Вырашыў паслухаць, што людзі гавораць, пагрэцца, падрамаць у цеплыні. Адпачыць у "дабрыні".

У вакзальнай пачакальні падсеў да яго вясковец, як высветлілася — лятун, адстаўнік пры маёрскіх пагонах. Паставіў салдацкі сідар, зняў фуражку з кукардай і паплакаўся Івану:

— Чуеш, бацька, Мікіта ракетаў накляпаў больш, чым каўбас, яму самалёты ўжо не трэба, рэжа іх аўтагенам. Дый якія самалёты! Уся авіядывізія слязьмі душылася, калі машыны аўтагенам секлі. Ястрабкі саўсім новыя, паўгода таму з завода прыгналі.

Лятун выцягнуў з салдацкага сідара пляшку "Маскоўскай", напоўніў алюмініевую кружку, якую ўзяў ад бачка з вадой у пачакальні, і працягнуў Івану:

— Давай, бацька, за вечную памяць ястрабкоў, ліха маці яго, Мікіты-знішчальніка...

Сустрэча з лётчыкам нагадала Івану, што пара наведаць той ушчэнт разбіты самалёт. Іван некалькі разоў вяртаўся сюды, у гіблыя мясціны. Былы кулямётчык быў упэўнены, што вайскоўцы абавязкова засякуць месца аварыі, абшныпараць усё навокал. У трэцюю ходку Іван знойдзе нямецкі скураны ранец, а ў ім дзіўныя карты, сакрэтныя дакументы. Патрапіцца сталёвы корцік і дзіўны бліскучы прадмет, назначэнне якому Іван так і не зразумее. Але што тут шукалі вайскоўцы?

Іван доўга будзе пазбягаць гэтых мясцінаў, памятаючы пра небяспеку. Заловяць салдаты, ухопяць за хіб і пацягнуць да начальства, табе — гамон.

...Злаваліся мянты. Швагра Паўла, братоў Івана, Валодзю і Васіля пасадзілі, загнаўшы на "лесапавальныя" дзялянкі ў Комі-край, а вось "палкоўніка" (мянушка Івана Бушылы), злавіць не маглі...

## "Брат" па лясной няволі

І сустрэўся яму воўк, лічы, лоб у лоб, як некалі худы немчык у акопе, у Польшчы. За плячыма ў нямецкага ваякі была стрэльба, а ў руках дзве алюмініевыя ёмкасці, салдацкі супец ды каша. І спалохаліся Іван ды Фрыц. Немец адно нервова ўсміхнуўся, патлумачыў "русу", што ён не салдат, не стралок, смерць не сее, а корміць, ён усяго толькі кухар. Іван апусціў аўтамат і павярнуў да сваіх, а немец спалохана перахрысціўся, залапатаўшы: данке, русішзолдацен...

... А вось цяпер, пасля вайны не фрыц-кухар, а воўк у пяці кроках. Звяруга насцярожаны, маўклівы. Так і свідравалі позіркамі звер і чалавек. Іван трымае ў галянішчы кірзача нямецкі корцік, той самы, лётчыцкі, гостры.

Вырашыў неяк пашастаць наўкола рэшткаў бамбавіка, а раптам знойдзе які харч, патрэбныя рэчы, нешта з адзення. І праўда, не пакідай на заўтра тое, што можаш зрабіць сёння. Асцярожна рушыў да месца аварыі, але спыніўся, пачуўшы гучныя мацюкі і грубую лаянку. З непрыхаваным страхам асцярожна пасунуўся бліжэй, убачыўшы, як шустрылі наўкола разбітага самалёта савецкія жаўнеры з аўтаматамі, узвод, не меней. І шныпарылі пад кожным дрэвам, нешта шукалі, гучна перагаворваліся. Камандаваў пошукамі малады старлей, трымаючы ў руках скураную планшэтку з разгорнутай картай.

Не ведаў Іван, што гэта не просты самалёт, а "спецборт", ён пэўна нёс у сваім чэраве шмат чаго каштоўнага. Ці не паспрыялі гэтыя акалічнасці таму, што тэрмін ляснога беспрытульнага бадзяння Івана Бушылы па лясных сцежках зацягнуўся да сівых валасоў?

*...У мурашніках хаваў шкляныя слоікі з прыпасамі, плёнку, сякеру, купленую яшчэ за польскім часам.*

*...Выбраў зручны, высакаваты ўзгорак, далей ад краю парослы берастам, ды густым лазавіннем і повен дзень ладаваў новы, утульнейшы табар.*

І зноў прыгадаўся лясны звяруга — воўк. Адчаюга стаяў, не варухнуўшыся. Няўжо ведаў, што ў гэтага насцярожанага чалавека напагатове гостры корцік. Воўк хворы, адбегаў сваё, цяпер у мясцовым калгасе і пажывіцца няма чым, бадзяга каторы дзень па лесе шастае з пустым кіндзюком.

Пасля Іван ваўкоў не баяўся і не думаў пра іх. А што ім дзяліць? Ён гэткі ж беспрытульны, адзінец. У абодвух той жа ратавальны лес — кармілец, лагво, котлішча.

## "Шинель у тебя больно окопная, вшивая"

Як ні асцерагаўся непажаданых сустрэч, але... Адвячоркам на лясной сцежцы заступілі дарогу трое ўзброеных. Адзін з іх, пэўна за старшога, у вайсковай, добра паношанай форме афіцэра, у расхрыстаным шынялі наставіў на Івана трафейны "вальтэр", строга запытаўся:

— Кто такой-такой? Почему один в лесу бродишь? Дезертир, небось? Шинель у тебя окопная, завшивел, бродяга лесной... Дакумент имеешь?

Двое маладзейшых — з нямецкімі аўтаматамі, насцярожаныя, маўклівыя.

Іван зірнуў на ўзброеных і спакойна растлумачыў:

— Мясцовы я... Кароўку шукаю, другі дзень не магу знайсці, адзіная карміцелька, — Іван паказаў шматок вяроўкі, перакінуты цераз плячо. Насіў з сабой і, бачыш, спатрэбілася.

— Далеко твоя коровка деру дала, — міралюбіва прагаварыў старшой. — Возьми на курево, только не болтай языком. Как дали на табачок, так и назад потребуем, — і ўручыў Івану пакамечаны чырвонец.

Іван крыху сумеўся, падзякаваў і рушыў далей, міжволі чакаючы стрэлу ў спіну, але пранесла.

*— Голад прыціснуў. Выць ад адчаю хацелася. Збіраў яйкі качак, але браў не ўсё: гняздо, палову пакідаў, каб і качаняты не зводзіліся, не хацеў качыную сямейку збузоўваць.*

*...Дзятлік асмялеў, калі я яго ссохлым хлебам пачаставаў. З маёй паходнай сумкі стаў правізію цягаць. Праб'е дзірку і ажно давіцца хлебам. Я за венічак — і па зладзюку...*

## Родны плямяш — надзейны сувязны

Паша, родны плямяш — надзейны сувязны з тым, закрытым для Івана светам. Паша дзядзьку ўсе вясковыя навіны перакажа.

А той, як біты жыццём воўк, цягаўся па лесе, насцярожана прыслухоўваўся да пошуму дрэў, лавіў новыя гукі. Не рыпане воз, не свісне пуга. Ага, невядомыя шастаюць, пэўна па яго душу. А раптам стрэл без папярэджання, — і няма пяхотнага байца-кулямётчыка. На вайне ўсё было акрэслена, пра цябе думала начальства вайсковае. Колькі пакласці пярлоўкі ў твой кацялок, якога гатунку даць махры на курыва, якія транты накінуць на плечы ваяра, у якую абуўку засунуць ногі, каб мясіць франтавую гразюку. І самае, самае, — набоўтаць сто грамаў, каб баец-пехацінец бадзёра пёр на фрыцаўскія агнявыя кропкі. Зампаліт назапасіў для служывых гарачых слоўцаў, нагадае пра Радзіму. Яна даўно крывёю абліваецца, на цябе надзею трымае...

...Іван цярплівы, дзень, два прасядзіць непадалёку ад сівых дубоў, схаваўшыся ў маліннік, цікуючы ў бінокль. Дзе ж ён, дарагі Паша, "партызанскі" сувязны з Бастыні? А мо вайна і не скончылася, перайшла ў новую катавасію. Баяліся палешукі чужынцаў, бо і свае ж партызаны немалую бяду чынілі. А цяпер лютуюць міліцыянты, мясцовыя энкавэдысты. Не даюць спакою ўпаўнаважаныя, шастаюць чыноўнікі з вобласці, старшыня калгаса за хіб возьме. А калі не ўгодзіш яму, да смерці помсціць будзе. І сена не накосіш, каня хваробу атрымаеш, на самыя катаржныя работы выпхне.

А як праклалі гравейку з Лунінца праз Бастынь — бяда. Паша гадзінамі, як Маратка Казей, кружыў па лесе, зашываўся ў гушчар, цікуючы, ці не прыляпіўся чужак. Каб жа хацелі, дык за тыдзень аблажылі, аднае роты чырвонапагоннікаў хапіла б.

*...У калгасе "Ленінскі шлях" столькі зарабляюць — певень больш надзяўбе.*

*...Дабіваюць палешукоў падаткамі, людзі клянуць Сталіна.*

*...Паляўнічы з Замошша Полько падарыў мне новую ватоўку... Барыс Брадніцкі падкідваў прыпасы, сальцо, цыбулю, махорку, соль... Без солі і табакі ў лесе — гамон!*

За гады бадзяння-хавання Іван Бушыла шмат чаму навучыўся, дый мінулая вайна — школа неацэнная, баявы гадок за чатыры лічыцца.

*...З многімі птушкамі я жыў у згодзе, дружыў, калі хочаце. Панадзілася хадзіць у госці рабчыха з рабчанятамі, вадзіла іх "купаць" у астылым попеле. Так распырхаецца сямейка рабчыная, што і ў чыгунок попелу нацярусяць.*

Не палічыць, колькі разоў прыходзіў сюды Іван, да вялікага валуна, хаваўся ў гушчар, як разведчык на фронце, сачыў за дарогай, якая бегла з Лунінца да Ганцавічаў і гублялася за паваротkай.

## Бастынскія цюцькі прызнавалі Івана

Дзіўна, але ўсе навакольныя сабакі, і не толькі бастынскія, прызнавалі Івана, сустракалі яго прыветна. А мо і праўда па сваім сабачым тэлеграфе перадавалі, што гэты маўклівы, асцярожны лясны чалавек аніводнай сабачай душы не зробіць ліха. Лес і блуднага сабаку мудрасці навучыць.

*...Прытуліўся да мяне сабачка Бімбус з Бастыні, цюцька Босы з Люшчы, дружна жылі. Весела вушастыя шасталі па лесе, мышэй лавілі і неслі мне. Маўляў, падзівіся, гаспадар, якія мы старанныя, працавітыя, пачастуй гасцінцам.*

*...Прыпяць у той год успухла, у пачатку 70-х. Вадой многія вёскі заліло, балоты апынуліся ў водным палоне, хадзіць было вельмі небяспечна. Спаў трывожна.*

*...Калі даводзілася цёмнай ночкай шыбаваць да хутара, каля хаціны дзіўным прысвістам падаваў знак цюцьку, і той прыветна падбягаў да мяне, віляючы хвастом. Я ласкава тармасіў Палкана, Тарзана ці Турнэпсіка.*

## Сустрэча з ваярамі Сцяпана Бандэры

Канец пяцідзесятых, нечаканая сустрэча з узброенымі хадакамі — пэўна прыблудзілі з украінскага боку. Ці не ад Сцяпана Бандэры адчайныя ваяры? Верасень, дзецюкі ў добрых світках, падперазаныя моцнымі скуранымі афіцэрскімі дзягамі, абутыя ў добрыя боты, на галаве цёплыя шапкі-стаўбуны. І ўсе з савецкімі аўтаматамі.

Сустрэўшы Івана загадалі:

— Дзядзька, давай балакай з намі по-білоруські, тоды і повірімо, што місцовы, не шкурнік. Звідкіль? З Бастыні? А ведаешь, дэ чырвоны воякі горылку п'ющь? То не ведаеш? А чому по лісу одын волочэшся, дый без зброі, усяляко можа буты. І не бойся, з такімі, як ты, мы не воюемо, на чырвоных жовнеров кулі зберегаемо...

У Івана для такіх нечаканых сустрэч аброць за плячыма. Бачыце, коніка шукаю, у лес збег, адзіны карміцелька на сям'ю з васьмі душ, і ўсе есці хочуць.

Паляшук заўсёды знойдзе выйсце з любога становішча.

Звяртаюся да Івана Бушылы з правакацыйным пытаннем:

...А чаму вы не падпільнавалі свайго даўняга крыўдзіцеля, не падлавілі момант — і карчом па чэкісцка-міліцэйскаму хрыбетніку? Вы ж мужчына, франтавік, колькі глядзелі смерці ў твар, перад кожным боем дасмальвалі табачны асмалак, апякаючы пальцы.

А ён адказвае:

— Махорца бастынскія мужыкі ў лесе падлавілі і давай частаваць каламі, уклалі ў магілу, — сабаку сабачая смерць.

## Мая начоўка ў лесе паблізу Бастыні

Цёплы лагодны жнівень. Сонца схавалася за лясок, пахаладала. Я шукаю прыдатнае месца, трэба ж паставіць палатку, тую самую, абмытую дажджамі тайгі, выцвілую на горным сонцы Паміра і Алтая. Пры мне паходная амуніцыя, як мае быць усё пад рукой, хаваецца ў рукзаку. І цёплы, падбіты воўнай спальны мяшок. Прыхапіў канцэнтраты для прыгатавання смачнага кандзёру ў лясных умовах, назапасіў і сушаніц жытнёвага хлеба.

Цягаю да котлішча сухастойнае галлё, весела зашугаў агонь. Рыхтую кандзёр, пара і на бакавую. У мяне над галавой не паліэтыленавая плёнка, як у Бушылы, а палатка-"серабранка", якую і праліўны дождж не прамочыць, і злосны ветрык у ёй не пагасцюе. Зашпільваю палатку, хаваюся ў бавоўняны спальнік. Пад рукой у мяне гострая сякера, імпартовая копанка для бліжняга штыхавога бою, дэсантны нож. Хоць і добра ўзброены, і агонь весела шугае, але неяк трывожна на душы. Здалёк чуцен брэх сабак.

Вось так і Іван Бушыла 42 гады запар укладваўся спаць пад трывожны начны шоргат, пошум хвой і елак, сабачыны брэх, ваўчынае выццё.

Ноччу я раптоўна падхапіўся, моцна ашчаперыўшы копанку для штыхавога бою. Зазірнуў у шчыліну палаткі і заўважыў воддаль постаць звера. Да гэтай постаці далучаецца другая, трэцяя. Гэтага яшчэ не хапала! Мне стала горача. Уявілася, як гайня кідаецца да палаткі. Добра, што пад рукой дэсантная копанка, сякера і нож...

## Сонца не закацілася, а мужыкі ў дупель!

Прыгадваецца паездка ў Бастынь у жніўні 2002 года. Нядзеля, сярэдзіна дня. Іду па вёсцы і бачу адно "вясёлых" мужыкоў. Каля плота ўжо ў "адрубе" — спяць чацвёра, а каля крамы двое "бяседнікаў" бяруць адзін аднаго за грудкі. Чуюцца адборныя мацюкі. І не сустрэў у Бастыні аніводнага дзецюка, ні кабеты ў чыстай вопратцы, усе ў зашмальцаванай. Мужыкі няголеныя, ва ўсіх вясковых на нагах брудныя чоботы-атопкі. У двара́х кабеты ў зашмальцаваных плюшаўках, ватоўках і салдацкіх бушлатах. Цярэбяць буракі, крышаць бульбу ў вялікія вепруковыя чыгуны, сякуць "пайку" ў карыце — хмурныя, засяроджаныя. Павітаешся — нешта бурkануць пад нос і за справу. І дарога да Бастыні ад Ганцавічаў бязлюдная. Праімчыць легкавік, і запануе трывожная цішыня.

На паваленым дрэве каля плота сядзіць сівы дзяцюк у вайсковым бушлаце, пэўна, ветэран. На маё запытанне, дзе ж людзі работныя, чаму ніхто сена не возіць, бульбу не капае, а вёска як вымерла, ён са скрухай адказвае:

— Усе гужавыя мужыкі ў сцельку п'яныя, а кабеты ў "вольным" палёце. А вы хто будзеце? — ён неяк падазрона зірнуў на мае фоталетапісцы — японскі "Нікан", "Зеніт"с тэлевіком, скураную кайстру праз плячо.

— Вы Івана Васільевіча Бушылу не ведалі? — пытаюся ў сівога дзецюка.

— А хто яго не ведае, - адказвае з неахвотай і дадае:

— Памёр небарака, "бандытам" і акалеў, без суда і следства. Быў і няма. Не жыў, як чалавек, і памёр, як вораг савецкай уласці...

Я кірую да хаты Пашы — пляменніка Івана Бушылы, таго самага, хто доўгія гады лучыў палескага ўцекача са знешнім светам, прыносіў дзядзьку і курыва, і хлеб, і да хлеба...

— Паша ў дупель! — адказвае яго жонка і паказвае на акно хаты, дзе праз шыбку бачу карэлыя ступакі гаспадара.

...Паша Зэк — сын швагера Паўла Сцяпанавіча Зылевіча — быў арыштаваны, па лжывым даносе сасланы ва Ухту Комі АССР, інвалід ІІІ групы. У 1963 годзе памілавалі Паўла Зылевіча, бацьку Пашы, братоў Івана —Уладзіміра і Віктара Бушылаў.

— Будзіць Пашу не буду! Пабудзіш, а ён дасць па мордзе і загадае бегчы купляць лекавую. А на крамную гарэлку ў мяне ні капейкі, - адказвае кабета.

Дзіўны феномен беларускай вёскі, якая ціха канае, спяваючыся.

...Памёр Іван Васільевіч Бушыла ў канцы 1999 года, роўна праз дзесяць гадоў як выйшаў з лесу. Жыў у Бастыні, хаваючыся ад людзей. Днямі прападаў у лесе, на золку сыходзіў у сваю "турму". Туліўся ў бакоўцы нядэшлай хаціны пляменніцы Вольгі Паўлаўны Карповіч, адвялі дзядзьку невялічкі куточак. Ложак з дошак, сеннік, побач паліца для будзённых рэчаў. Праз вузенькае акенца праглядваецца цёмная сцяна лесу, шнуры агародаў, калгаснае поле.

І ноччу трывога брала Івана. Раптоўна падхопіцца, ватоўку на плечы, босыя ногі ў кірзач і туды, у цёмную прорву лесу. Там ён вольны, пан сабе і начальнік. І воўк яму за сябра, чорны груган уранні песню праспявае, залатая восень грыбочкам адорыць. "Як на цвіках сядзеў. Сам у лесе, а душа — у Бастыні. А пасяліўся ў вёсцы, душа ў лес гукае", — жаліўся сваякам.

Пражыў жыццё чалавек, а засталася адно рысачка паміж датамі. І тая рысачка ўмясціла семдзесят з лішкам пражытых гадоў, ды як пражытых...

**P.S.** Хадзіла пагалоска, што Іван Бушыла атрымаў у канцы вайны ад "смерша" спецзаданне. Той начальнік, які благаславіў яфрэйтара на баявую дзялянку, быў забіты, жывая нітачка абарвалася. Іван Бушыла надоўга застаўся ў лесе, шукаючы разбіты бамбавік з каштоўнасцямі і сакрэтнымі дакументамі.

І быў у яго сапраўдны прыстанак, ладная зямлянка ў "шэсць накатаў", яшчэ хлопцамі Васіля Каржа змайстраваная ў гады партызанкі. І печачку ў ёй паставілі, вяселы дымок хаваўся пад зямлёй. Забрацца ў схованку можна было па таемным падземным уваходзе, а выбрацца на волю праз сотню метраў адсюль. Зручны прыстанак, "партызанскае" котлішча. Тут і ратавальныя балоты гараць, зямля курыцца ўжо колькі гадоў запар.

А для цікаўных газетчыкаў хітры і мудры паляшук паказваў свой сіроцкі паліэтыленавы шалашык, напханы зляжалым сенам? А каму трэба тая праўда? Мясціны тут ціхія, людзі затурканыя, туляцца сярод балотаў, жывуць каля лесу, дый жыццём ой як навучаныя. Таму і асцярожныя, не кожнаму сустрэчнаму давeрацца. Ты прыехаў, паўдня пагойсаў і знік, а ім жыць далей. Так і жывуць і будуць жыць...

**Фота аўтара.**



*Ніл ГІЛЕВІЧ*

# Лірыка

***(амаль інтымная)***

***

*Не кайцеся і не перажывайце,*
*Калі не ўставілі маё імя*
*У свой артыкул. Там, дзе страх на варце*
*Душы і сэрца, — выйсця ў вас няма.*

*Калі ж хто іншы неабачна ўставіў,*
*А вы — рэдактар, — тут жа, без размоў,*
*Выкрэслівайце! Сам таварыш Сталін*
*Не чыкаўся — выкрэсліваў сяброў.*

*Дый што тут чыкацца? Пара прывыкнуць*
*Да духу часу: рэж і не зявай!*
*Забавішся — цябе самога чыкнуць!*
*Як міленькага! Чыкнуць — і гуд бай!*

*Таму я раю вам зусім не жартам:*
*Не здумайце ўстаўляць маё імя*
*У свой артыкул! Калі ж вы рэдактар —*
*Выкрэслівайце ўсімі чатырма!*

*То-бок, і пярэднімі, і заднімі.*

*2009*

### Вось і вынікла думка...

*— Што ўсміхнуўся мне сумна? Чаго так*
*З угляданнем ты госця сустрэў?*
*Узлякнуўся, што, твой аднагодак,*
*Я так моцна, як грыб, састарэў?*

*Што і ты ўжо, раз вылезла грыва,*
*Абнямоглы старлыба такі?*
*Не хвалюйся: на ссохлага грыба*
*Ты не цягнеш, хоць мы і гадкі.*

*— Усміхнуўся я з іншага, браце.*
*Зараз зноў ты пагоніш шуму,*
*Што няма нам жыцця ў сваёй хаце...*
*Дык вось я дакумекаў — чаму.*

*Помню, бабка ўшчувала малога:*
*"Што ж ты гэта, унучачак мой,*
*Не памыўшыся, молішся Богу?*
*Бог не прыме малітвы тваёй.*

*Трэба, коце, памыцца спачатку,*
*Бо пакрыўдзіцца можа Гасподзь.*
*Не ўпачцівіш і Боскую Матку.*
*Дух не чысты, дзе брудная плоць..."*

*Вось і вынікла думка з аблогу:*
*Ці не ў гэтым і наша бяда?*
*Не памыўшыся, молімся Богу,*
*А нямытых яму не шкада...*

*Хочам ласкай яго заручыцца,*
*Забываем, аднак, што спярша*
*Трэба чыстай вадзіцай памыцца,*
*Добра ў мызу пялёхнуць з каўша...*

*— Дзякуй Богу, што гэтакім чынам, —*
*Падагуліў з усмешкаю госць, —*
*Бабка мыцца цябе прывучыла...*
*Ну, а ў думцы тваёй... нешта ёсць!*

*2009*

### Хоць ад такой!..

*Па змярканні, як пачне вячэрні холад*
*На зямлі даймаць гнюсоту ўсё мацней,*
*Па парэнчыне нахільнай край усходак*
*Слімакі паўзуць угору — дзе цяплей.*

*Кожны раз, як, бласлаўіўшы сон сядзібы,*
*За парэнчыну вазьмуся я рукой —*
*"Цьфу ты, набрыдзь! — скалануся ад агіды. —*
*Божа! Збаві ад брыды!.. Хоць ад такой!"*

*2009*

***

*На верандачцы зашклёнай,*
*Поўнай сонца, — поўна вос.*
*Іх гняздо ў застрэшку недзе.*
*Хто ж іх столькі тут натрос?*

*Зрэшты, так было і летась.*
*Спелы жнівень — іхні час.*

*Моўчкі поўзаюць па шыбах,*
*Каб знайсці на волю лаз.*

*Расчыніў ім дзверы насцеж:*
*Вылятайце! Воля — там!*
*Бо замкну тут, на верандзе, —*
*Гора, воскі, будзе вам.*

*2009*

### Дыфірамб доўгачаканаму дажджу

*Спярша вятрыска наляцеў,*
*Тугою хваляй шугануў,*
*Лісцём асін зашалясцеў,*
*Дубам чупрыны ўстрапянуў,*
*І ўлёгся ў міг, і лес заціх,*
*Як бы дыханне затаіў...*
*І вось, і вось — закапаў дождж,*
*Зашапацеў, загаманіў,*
*Усё спарней, мацней, гучней,*
*Ягоны важкі, роўны шум*
*Увесь прастор запаланіў,*
*І ўсё, што мне гняло душу,*
*Няўзнак сышло, як не было.*
*Як уваскрэслы, я гляджу*
*У вочы боскія дажджу*
*І выгукаю: лійся, лійся*
*На ўсмяглы лес, на ўсохлы дол,*
*На травы жухлыя, на лісце,*
*На ўсё паніклае наўкол!*
*Паі, напойвай, абмывай*
*Усю зямлю, увесь наш край,*
*Увесь — наўсцяж,*
*Увесь — суздром...*
*Ах, каб яшчэ дый грымнуў гром!*

*2009*

***

*О, як узляцеў я*
*На крылах свабоды*
*Гадоў васемнаццаць таму:*
*Нарэшце! Нарэшце! —*
*І ўжо назаўсёды! —*
*Народ мой пакінуў турму!*

*А вось жа і сёння*
*Ірвуць як ірвалі*
*Душу мне і Захад і Усход.*
*Як ты замінаеш ім,*
*Мой утрывалы,*
*Мой добры, пад Богам, народ!*

*2009*

Народная Воля http://www.nv-online.info
24—28 СНЕЖНЯ 2009 г.

НУ І НУ!

## Мінчанін паўтарыў «подзвіг» Юрыя Дзетачкіна

**Супрацоўнікі Маскоўскага РУУС сталіцы затрымалі 44-гадовага мінчаніна, які скраў металічны гараж.**

Як паведамляецца на сайце ГУУС Мінгарвыканкама, спосаб крадзяжу быў запазычаны са старой савецкай кінакамедыі "Сцеражыся аўтамабіля". Спачатку зламыснік па аб'явах знаходзіў пакупнікоў металічных кантэйнераў, затым у дварах дамоў шукаў прымальны варыянт. Адзін з такіх варыянтаў знайшоўся на вуліцы Розы Люксембург.

Для таго каб скрасці гараж, мужчына заказаў грузавы аўтакран, аднак той не змог падняць кантэйнер, у якім знаходзілася вялікая колькасць будматэрыялаў. Праз некалькі дзён "аперацыя" ўдалася пры дапамозе больш магутнага пад'ёмнага механізму з найбліжэйшай будоўлі. У выніку металаканструкцыя з будматэрыяламі адправілася да пакупніка за горад. Уладальнік кантэйнера тым часам знаходзіўся ў камандзіроўцы.

Выйсці на злачынца атрымалася дзякуючы пільнасці суседа гаспадара гаража. Ён бачыў першую спробу крадзяжу і, ведаючы, што кантэйнер ніхто прадаваць не збіраўся, запісаў нумар крана. Спачатку міліцыя ўстанавіла машыну, потым яе вадзіцеля, а затым і арганізатара злачынства. Яму прад'яўлена абвінавачанне ва ўчыненні буйнага крадзяжу — кошт скрадзенага ацэньваецца ў 5 млн рублёў.

**Вячаслаў БУДКЕВІЧ, БелаПАН.**

ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...

## Амаль чвэрць расстраляных у Катыні афіцэраў польскай арміі былі беларусамі

**Пра гэта заявіў кандыдат гістарычных навук, даследчык савецкіх рэпрэсій на Беларусі Ігар Кузняцоў.**

Гісторык сцвярджае, што з 4421 афіцэра польскай арміі, расстралянага НКУС у Катыні пад Смаленскам (Расія) у красавіку—маі 1940 года, 1059 з'яўляюцца беларусамі. Паводле яго слоў, калі да гэтай лічбы далучыць ахвяраў Катыні — яўрэяў і палякаў з Заходняй Беларусі, то агульная колькасць расстраляных пад Смаленскам афіцэраў польскай арміі — выхадцаў з Беларусі — можа скласці каля 2 тысяч чалавек, амаль палову расстраляных. Дык чаму ж для палякаў Катынь — трагічны мемарыял, а для беларусаў — не?..

## Лукомльскую ДРЭС будуць дабудоўваць кітайцы

**Прынята рашэнне пра будаўніцтва новага, 9-га энергаблоку найбуйнейшай у Беларусі Лукомльскай электрастанцыі. Такой маштабнай будоўлі тут не было з 1974 года.**

У Новалукомлі чакаюць прыезду кітайскіх рабочых — менавіта яны будуць узводзіць новы энергаблок магутнасцю 450 МВт. Гэта прадугледжана ўмовамі так званага "звязанага" крэдыту, згодна з якім Кітай не толькі выдаткоўвае сродкі на будаўніцтва, але і прысылае на будоўлю сваіх спецыялістаў і абсталяванне. Як паведамляюць незалежныя СМІ, мясцовыя жыхары незадаволены гэтым фактам, бо ў самім Новалукомлі, дзе месціцца ДРЭС, і асабліва ў райцэнтры Чашнікі — вялікае беспрацоўе. Людзі спадзяваліся працаўладкавацца хоць на час будаўніцтва, а цяпер такіх перспектыў няма.

## Кантрабанда ў... мячах

**Футбольны трэнер з Беларусі правозіў у Польшчу цыгарэты ў мячах. З мячоў і багажу польскія мытнікі выцягнулі 500 пачкаў цыгарэт.**

Як паведамляе "Еўрарадыё" са спасылкай на польскі інтэрнет-партал "Moje Miasto", падчас мытнага кантролю аўтобуса, у якім на футбольны матч у Польшчу ехала маладзёжная футбольная каманда з Гродна, польскія мытнікі знайшлі ў футбольных мячах нелегальныя цыгарэты.



Падазрэнні мытнікаў выклікала вялікая сумка з мячамі. Падчас агляду яны заўважылі, што некаторыя мячы абкручаныя бясколерным скотчам. У іх, а таксама ў багажы, былі знойдзены 500 пачкаў цыгарэт.

У кантрабандзе прызнаўся 39-гадовы трэнер каманды. Супрацоўнікі мытні канфіскавалі кантрабанду і выпісалі трэнеру грашовы штраф.

ВІНШУЕМ!

*Заслужаны артыст Беларусі Анатоль КАШТАЛАПАЎ:*

# «Хай кожны дзень вам дорыць свята»

## *Дзяржаўнаму ансамблю народнай музыкі «Свята» — 25 год!*

*Ці то з чысціні прамытага дажджом паветра, ці то з празрыстай азёрнай сінечы, ці то з самага сэрца зямлі струменіць пяшчотай хвалісты блакіт. І раптам, бы сонца з-за небакраю, успыхвае-іскрыцца агнявістая песня, віхурыць танец, заліваюцца цымбалы і гармонік...*

*На сцэне — "Свята", і свята ў перапоўненай філарманічнай зале. Вялікім канцэртам напярэдадні Новага года адзначыў свой чвэрцьвекавы юбілей славуты мастацкі калектыў краіны.*

*Пасля канцэрта мы сустрэліся з мастацкім кіраўніком ансамбля, заслужаным артыстам Беларусі **Анатолем КАШТАЛАПАВЫМ**.*





...Помніцца, як шмат гадоў таму абаяльны светлагаловы хлапец, упершыню з'явіўшыся перад публікай, адразу ж і назаўжды счараваў сваім багатым, шматгранным дарам, жывой непасрэднасцю, адметнай беларускасцю. Ён нагадваў Коласавага Сымона-музыку, хоць іграў не на адным інструменце, а на многіх: на гармоніку, розных дудках, дудачках і свісцёлках, акарыне і нават на лыжках. І спяваў, і танцаваў яшчэ як! Уседзець было немагчыма. У ім свяціліся душа, шчырасць, цеплыня, мяккі гумар.

Прайшлі гады — і што? Колішні юнак, ужо мэтр у народным мастацтве, — па-ранейшаму малады душою чараўнік. І зараз выходзіць на сцэну са сваімі маладзейшымі сябрамі і аказваецца ў эпіцэнтры сцэнічнай дзеі і глядацкай увагі. Па-ранейшаму іграе і танчыць, асляпляе сваёй усмешкай. У адказ — авацыі, вокрыкі "Брава!".

**— Скажыце, Анатоль Міхайлавіч, адкуль бярэцца талент? Вы ўжо напэўна ведаеце.**

— Каб жа хто мог разгадаць гэтую таямніцу! Якуб Колас, памойму, пра тое трапна сказаў: *"Ад гоману бароў, ад казак вечароў, ад песень дудароў... Ад тысячы ніцей, з якіх аснована і выткана жыццё".*

Колькі помню сябе — а дзяцінства маё прайшло ў вёсцы Шапчыцы на Магілёўшчыне, — заўсёды цягнула нейкім магнітам на голас песні, музыкі. Бацькі, калі бралі з сабою на кірмаш, не баяліся згубіць мяне ў вірлівым натоўпе. Спакойна займаліся сваімі справамі і заўсёды беспамылкова знаходзілі там, дзе чуўся гармонік, прыпеўкі. Стаяў я там бы ў зямлю ўкапаны, з разяўленым ротам...

Дзед Самсон — во легендарнае імя! — выдатна спяваў, а мама — ці не дзіва — любіла часам насвістваць. І мне казала: "Ой, глядзі, свістуном будзеш!"

**— Выходзіць, як у ваду глядзела?**

— Падобна на тое. Ёсць тут нешта прыроднае, ад бацькоў, на генным узроўні перададзенае. Вунь наша цудоўная спявачка Люся Кірыленка прывяла ў калектыў свайго сыночка-другакласніка Уладзіка. Вы бачылі яго на юбілейным канцэрце, у дуэце з крыху старэйшай Лізай Заяц "Цячэ вада ў ярок", нашу "фірменную", перанятую ад непаўторных Святланы і Уладзіміра Салодкіх, спявалі. А самы меншанькі яе ў свае паўтара гадочка, распавядае Люся, ужо зараз артыстам расце. Толькі музыку пачуе — аж гарыць, выбівае такт, прытанцоўвае. Ну як жа: маці, калі выношвала дзіця, сцэну не пакідала, так і жыве спяваючы.

Дай Бог, каб усё збылося. Толькі ці стануць дзеткі адораных бацькоў сапраўднымі артыстамі, ад іх саміх залежыць. Ад усведамлення самага простага: патрэбна бясконцая праца, праца, праца, праца.

**— Гэта ваша творчае крэда?**

— Без працы любы талент і творчасць на нуль звядуцца. Мне, лічу, вельмі пашчасціла на настаўнікаў у мастацтве. Спачатку, калі пачынаў яшчэ ў "Харошках", Валянціна Іванаўна Гаявая вучыла, як не стаяць стаўбуном на сцэне, а іграць і танчыць ды яшчэ задавальненне адчуваць і ўсміхацца. Ох, і папацець давялося, ды недарэмна. Навечна ўдзячны дарагой настаўніцы, яе ласкавай упартасці за ўрокі майстэрства.

**— А чаму навучыліся ў стваральніка "Свята" Васіля Купрыяненкі?**

— О, гэта проста фантастычны талент, мастак ад Бога. І ад зямлі. Даў мне зразумець і адчуць, што першакрыніца мастацтва — у народзе. У народнай скарбніцы трэба шукаць і збіраць дыяменты, што перажылі і час, і забыццё. Беражліва, з любоўю ачыраць іх ад пылу, даваць новае жыццё і вяртаць людзям іх жа багацце ў новым бляску, красе і ззянні.

Колькі мы з ім пахадзілі-паездзілі па Палессі, цягаючы на сабе тагачасны пудовы магнітафон, ад вёскі да вёскі. Колькі ўсяго запісалі, што потым зайграла-заспявала-затанцавала ў нашых праграмах, стала іх украсай. Па-маладому загучала і залівістая полька, што "выпрасіў" у аднаго дзядка на Віцебшчыне. А васьмідзесяцігадовая бабулька, калісьці першая скакуха на сяле, выдала такі "канкан", што ў мяне ад здзіўлення і захаплення аж вочы на лоб палезлі. Яна ж яшчэ і пацвельвалася, што я няўклюда, за ёю ўслед не паспяваю...

Не, не памыляліся нашы вялікія настаўнікі Рыгор Раманавіч Шырма і Генадзь Іванавіч Цітовіч, перакананыя ў тым, што ў народнай творчасці — праўда жыцця і душа народа, ягоныя мары і надзеі, трывогі і радасці. І калі сам усё гэта не перажывеш усёй істотай, а проста "адбываеш" нумар хай сабе і на прафесійным узроўні, нічога путнага не атрымаецца: абыякавасць, душэўная пустэча выканаўцы — гэта на сто працэнтаў абыякавасць публікі. А тады і агарод гарадзіць няма чаго.

**— Людзі творчыя, вядома, — складаныя асобы, характары. Ці цяжка знайсці з усімі агульную мову, стварыць ансамбль з непадобным тварам?**

— Дзякуй Богу, мы з сябрамі па калектыве — аднадумцы, аднаой крыві. Я іх люблю і любуюся імі — іх талентамі, іх самаадданай. Прызнацца, кіраўнік я жорсткі, "муштрую" сваіх улюбёнцаў як мае быць, дабіваючыся філіграннасці. Але ніхто не крыўдзіцца, кожны шчыруе ўпарта, з натхненнем. Яны імкнуцца да яшчэ не спасцігнутага, растуць на вачах — ад канцэрта да канцэрта, ад рэпетыцыі да рэпетыцыі раскрываюцца ў новых і новых сваіх якасцях. І я шчаслівы, што мяне разумеюць, што нават самая цяжкая праца для нас — свята.

**— Дарэчы, пра цяжкасці. Можна пацікавіцца, колькі важыць, да прыкладу, вось гэты невялікі гармонік, з якім вы так выдылінгвівалі на юбілейным канцэрце?**

— Гэты, самы маленькі? Ды нямнога, усяго восем кілаграмаў — не тое што масіўны баян... А вы заўважылі, якія "па" выраблляў наш Андрэй Маханёк, носячыся па сцэне са сваім барабанам? Вачэй не адвесці — зух, віртуоз, агонь, нязменны пакаральнік публікі. Ды і ўсе астатнія былі гледачам да душы.

**— Дзе ж вы знаходзіце такіх самародкаў? У вас, можна сказаць, зорны склад з прадстаўнікоў розных пакаленняў.**

— Зоркі самі па сабе не запальваюцца. Талент трэба ў час заўважыць, падтрымаць, даць дарогу. Вось Лізачку Заяц я прыкмеціў на абласным дзіцячым конкурсе ў Магілёве: чысты, яркі голас, прыродная адоранасць. Хай, думаю, расце ў нас пераемніцай, хай пойдзе далей за нас. Цяпер дзяўчынка з радасцю і ахвотай ездзіць на рэпетыцыі і выступленні разам з мамай ажно з-пад Асіповічаў.

У нашай краіне пры ўсіх цяжкасцях, лічу, склалася пэўная сістэма адбору і падтрымкі таленавітай моладзі. Тую ж цяпер знакамітую Ксенію Сітнік з Мазыра таксама на падобным конкурсе ўбачылі. На таленты Беларусь багатая, толькі б іх не разгубіць.

Прынамсі, наш калектыў мае дзяржаўную падтрымку ў набыцці інструментаў, касцюмаў, адчувае паўсядзённую ўвагу мастацкага кіраўніка Белдзяржфілармоніі Юрыя Гільдзюка.

**— Што вы больш за ўсё цэніце ў сваіх калегах?**

— Уявіце сабе, не толькі высокі прафесіяналізм (гэта само сабою). Мне вельмі важныя чалавечыя якасці артыста. Чым поўніцца яго душа? З чым ён выходзіць на сцэну, як разумее сваё прызванне? Мне дорага, што сябры вельмі любяць і паважаюць сваіх гледачоў, не шкадуюць ні сіл, ні часу, каб рабіць для іх прыемныя сюрпрызы. Прыкладам для моладзі — заслужаная артыстка Беларусі Марыя Маршак, якая не стамляецца шліфаваць сваё майстэрства. А наша Танечка Сушчэня — лаўрэат міжнародных конкурсаў? Прыйшла да нас пасля Акадэміі музыкі ўжо даволі вядомай цымбалісткай і чаруе публіку не адно бліскучай ігрой на сваім інструменце, а і паэтычнасцю танцавальнага дару. Старанна займаецца ў харэаграфічным класе, каб лётаць па сцэне лёгкакрылай птушкай, даравітая танцорка Святлана Байдак. Не лянуецца працаваць над сабой юная Людачка Галавач. Набіраюць творчую сілу харошыя хлопцы з Універсітэта культуры і мастацтваў Валодзя Быкаў і Саша Грыз. Я танцую разам з імі і адчуваю іх хваляванне: ці ўсё ўдалося, як задумана, ці не расчаравалі тых, хто прыйшоў на канцэрт?

А што ўжо казаць пра бліскучых вакалістаў, глыбокіх знаўцаў народнай песні Вячаслава Статкевіча — майго надзейнага дарадцу і памочніка ў творчых і арганізацыйных справах — і Васіля Сатваронната, які яшчэ і педагог у вакальным класе. Кожны, і тыя, каго не здолеў назваць, — яркія зорачкі-залацінкі.

**— Прызнайцеся, Анатоль Міхайлавіч, вам не даводзілася чуць скептычныя выказванні кшталту: ну каму, маўляў, цікавая ў наш бурлівы век з ягонымі шалёнымі рытмамі тая народная музыка — хіба што дзядулям і бабулям, апошнім магіканам вёскі?**

— А-такі даводзілася. Бывае, выгружаеш з машыны інструменты, а ўслед: "Ну вось, цымбалы дапатопныя..." Ды гэта — толькі да першага дакранання музыканта да струнаў. Бо ад першага і да апошняга нумара — бура апладысментаў, удзячных воклічаў, ціхіх добрых слоў. Пасля выступлення падыходзяць, каб дакрануцца рукамі да інструментаў: "Глядзі-ка — сапраўдныя! І вы самі, жыўцом, выходзіць, спявалі-ігралі? Во дзіва, мы ж баяліся — "электрыка" ўсё рабіць будзе..."

Людзі ўжо стаміліся ад металічнага грому-скрыгату аглушальнай "электрыкі" і фальшу "фанеры", ад безгалосасці, халтуры і падману на сцэне. Іх цягне да жывога, гаючага, сапраўднага ў мастацтве. І таму нас слухаюць не толькі бабулькі, перад якімі мы, як і перад усімі людзьмі старэйшага пакалення, схіляемся ў нізкім паклоне. За тое, што праз жыццё даюць нам хлеб надзённы, цярпліва трымаюць на плячах цяжар перажытага і не закарэлі сэрцам, адкрытым для іскрынкі святла.

Мы з вялікай радасцю ездзім з сябрамі ў глыбінку, па сельскіх клубах і Дамах культуры, дзе, гавораць, раней не ступала нага "жывога артыста". У Белдзяржфілармоніі ёсць цэлая праграма вясковых тураў усіх мастацкіх калектываў і асобных выканаўцаў. Ад такіх сустрэч самі душэўна багацеем, творча расцём.

**— Вядома, што вашы вандроўкі — вандроўкі трыумфальныя — пралеглі і далёка за межамі Беларусі...**

— Можна сказаць, ва ўсе канцы свету. І ў Афрыцы пабывалі, і ў Японіі, і ў Кітаі, і ў Карэі, і ў Канадзе, і ў Венесуэле, і ў Еўропе. Вось толькі апошнія паездкі. У Лондане выступалі ў адным са знакамітых касцёлаў у прысутнасці мэра і іншых знаных людзей. А нядаўна вярнуліся з Расіі, з-пад Калугі, дзе ўдзельнічалі ў цырымоніі ўрачыстага адкрыцця "Белорусского и украинского подворья" ў культурна-асветным цэнтры "ЭкоМир". Было вельмі цікава, і не толькі нам. Хвалюе і кранае, што беларускае мастацтва, нашу песню, музыку (можа, гэта гучыць і нясціпла) паўсюдна прымаюць на "ўра", разумеюць, нават не разумеючы ні слова. І па іх пазнаюць Беларусь, душу нашага народа. Музычная мова — універсальная, гэта надзейны мост між рознымі краінамі і кантынентамі ў сённяшнім трывожным свеце.

**— Некаторыя кажуць, што зараз людзям наогул не да высокага мастацтва — час, маўляў, складаны, нялёгкі.**

— А калі ён быў простым і лёгкім для нашага народа? То войны, то рэпрэсіі, то галадуха. А людзі заўжды шукалі ў песні, калі яна ад жыцця, і ўцеху, і суцяшэнне, і паратунак. Нават у самыя трагічныя моманты... Аднойчы ў вёсцы мне распавялі пра страшны выпадак пары ваеннага ліхалецця. Паставілі жанчыну пад расстрэл за тое, што пякла хлеб партызанам, а да ног бязлітаснага нелюдзя з плачам кінуўся хлопчык-малеча: "Дзядзечка, не страляйце маю мамку — я вам "Пасею гурочкі" спяю..."

У памяць аб тым хлопчыку з расстраляным на вуснах спевам, у памяць яго маці і ўсіх ахвяр жудаснай ваеннай навалы зараз гучыць са сцэны тая народжаная ў народзе песня "Пасею гурочкі" — ужо ў выкананні артыстаў сённяшняга пакалення.

Усё ж давайце ўсміхнёмся і павіншуем адзін аднаго з надыходзячым Новым годам і Каляламі, звернемся да блізкіх і далёкіх са шчырымі зычаннямі свята ў сэрцы і самага найлепшага, чаго жадае сабе самому кожны чалавек! І чаго жадаем мы ўсе сваёй найлюбай, дарагой Бацькаўшчыне — Беларусі. А лепш, бадай, сказаць словамі нашай песні "Добрым людзям":

*Хай ад бліноў плыве дымок,*
*Стаіць вякамі ваша хата,*
*Хай ад бяды ратуе Бог,*
*І кожны дзень вам дорыць свята!*

**— І вам, і вашаму "Святу" — віншаванні з юбілеем і Новым годам, пажаданне новых вяршынь і новых радасцей на творчым шляху.**

**Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.**

## Каму свята, каму праца

**У ноч з 31 снежня 2009 года на 1 студзеня 2010 года наземны грамадскі транспарт у Мінску будзе працаваць да 5.30.**

З інтэрвалам 15 хвілін будуць хадзіць аўтобусы па маршрутах: №1 "Дыспетчарская станцыя (ДС) "Вяснянка" — Вакзал", №27 "ДС "Ангарская-4" — Сасновы Бор", №91 "Аўтавакзал (АВ) "Маскоўскі" — Вяснянка", №95 "ДС "Славінскага" — Сцяпянка", №100 "Аэрапорт "Мінск-1" — АВ Маскоўскі" (інтэрвал — 8 хвілін). Тралейбусы па маршрутах: №1 "ДС "Зялёны Луг-7" — АВ "Маскоўскі", №13 "ДС "Захад-3" — Гарадскі Вал", № 41 "Малініна — ДС "Уручча-2", № 65 "ДС "Малінаўка-4" — Дружная". Трамваі па маршрутах: № 1 "пл. Мяснікова — Зялёны Луг", № 3 "Возера — Серабранка".

Да 3.30 1 студзеня з інтэрвалам 15 хвілін будуць працаваць аўтобусы па маршрутах: №29 "ДС "Кунцаўшчына" — Кульман", №35 "ДС "Дружная" — Брылевічы", №42 "ДС "Кунцаўшчына" — Сухарава-6", №52 "ДС "Лошыца-2" — Вакзал", №72 "ДС "Шабаны" — Ст.м. "Магілёўская", №73 "ДС "Сярова" — Вяснянка", №99 "ДС "Уручча-4" — 9-ы км", №113 "АВ "Маскоўскі" — Тубдыспансер" (інтэрвал — 30 хвілін), №121 "ТЦ "Ждановічы" — Сухарава-6". Тралейбусы па маршруце: №26 "ДС "Чыжоўка" — Кабушкіна", №27 "ДС "Дружная" — Курасоўшчына", №32 "ДС "Малінаўка-4" — Вакзал", №48 "Сухарава — ДС "Кунцаўшчына", №51 "ДС "Дружная" — Курасоўшчына", №53 "ДС "Малінаўка-4" — ДС "Зялёны Луг-7", №60 "ДС "Ангарская-4" — Ст.м. "Магілёўская", №62 "ДС "Уручча-2" — ДС "Уручча-4".

Праца метрапалітэна 1 студзеня будзе арганізавана да 03.00.

ДИКОСТЬ!

## Житель Барановичей посадил сына на цепь

За истязание собственных детей осужден житель Барановичей, сообщила БЕЛТА старший помощник прокурора Брестской области Ольга Дмитрук.

Приговор был вынесен судом Барановичского района и города Барановичи. Отец троих несовершеннолетних детей, ранее дважды судимый за кражи 36-летний мужчина, признан виновным в преступлении, предусмотренном ч.2 ст.154 ("Истязание") УК Беларуси.

В мае 2009 года этот мужчина за незначительную провинность причинил зажигалкой термические ожоги своему семилетнему сыну, которого затем посадил на цепь в ванной. Восьмилетней дочери, пытавшейся защитить брата, были причинены термические ожоги окурком сигареты.

Приговором суда отцу назначено наказание в виде 3 лет и 8 месяцев лишения свободы в колонии общего режима. Причем осужденный вины в истязании детей не признал. Он, видимо, считает, что к детям можно применять любые методы воспитания.

ТРЫВОЖНА

## П'яная жаночая доля

**У Брэсцкай вобласці за апошнія пяць гадоў колькасць жанчын з алкагольнай залежнасцю, якія стаяць на ўліку, узрасла амаль у два разы. Пра гэта паведаміла загадчыца аддзела Брэсцкага абласнога наркадыспансера Святлана Кузьміцкая на пасяджэнні "круглага стала", прысвечанага праблеме жаночага алкагалізму.**

Паводле слоў спецыяліста, на 1 кастрычніка гэтага года ў вобласці на наркалагічным уліку стаяла 28.304 хранічных алкаголіка, з іх 4255 — жанчыны (109 з іх з алкагольным псіхозам). За дзевяць месяцаў гэтага года з такімі найбольш цяжкімі сімптомамі залежнасці (псіхозамі) ад алкаголю ўзяты на ўлік 33 жанчыны і 248 мужчын.

Дарэчы, спецыялісты падкрэсліваюць, што жанчыны, як правіла, хаваюць сваю залежнасць ад алкаголю, таму яны трапляюць у поле зроку медыкаў пры больш запушчанай стадыі захворвання і лячыць яго складаней. Пры гэтым у жанчын залежнасць фарміруецца пазней, чым у мужчын.

"Ёсць тры асноўныя катэгорыі жанчын, якія п'юць. Гэта бізнес-вумен, якія днём шмат і напружана працуюць, а вечарам здымаюць напружанне алкаголем. Другая катэгорыя — забяспечаныя жанчыны, якія не працуюць, бавяць час у кампаніі падобных да сябе за кубкам кавы і бакалам спіртнога. Трэцяя — адзінокія жанчыны, з цяжкім лёсам, якія спрабуюць заглушыць душэўны боль алкаголем", — сказала Кузьміцкая.

**Ларыса ШЫГАНАВА, БелаПАН.**

Народная Воля
http://www.nv-online.info
24—28 СНЕЖНЯ 2009 г.

## ПОНЕДЕЛЬНИК, 28 ДЕКАБРЯ

### Первый

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** "Новости".
**06.05, 07.05, 08.10** "Доброе утро, Беларусь!".
**06.45, 07.45, 18.50, 01.05**"Зона Х".
**07.30, 08.25, 11.50** "Деловая жизнь".
**08.30** "В мире моторов".
**09.10** "Nota Bene".
**09.40** "Звездные танцы. Женский сезон".
**11.00, 17.45 "Не родись красивой".** Сериал.
**12.10 "Звездный крейсер "Галактика".** Сериал.
**13.10 "Вероника Марс-3".** Сериал.
**14.05** "Жизнь как жизнь".
**15.15, 19.20** "Новости региона".
**15.25** "Культурные люди".
**15.55** "Здоровье".
**16.25** "Off Stage Life".
**16.40 "Сестры по крови".** Сериал.
**19.30** "Арена".
**19.55** "Ответный ход".
**21.00** "Панорама".
**21.50** "Итоги-2009. Политика".
**22.15 "Части тела".** Сериал.
**01.10** "День спорта".
**01.25** "Хоккей для всех".

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.55, 01.05** "Наши новости".
**06.05** "Наше утро".
**09.05** "Контуры".
**10.10 "Как рождаются тосты".** Худ.фильм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.10, 01.20** "Новости спорта".
**11.10** "Рекламная пауза".
**12.00** "Малахов +".
**13.10** "Понять. Простить".
**13.40** "Модный приговор".
**14.45** "Контрольная закупка".
**15.15 "Любительница частного сыска Даша Васильева".** Сериал.
**16.15 "Монтекристо".** Сериал.
**18.20 "Моя прекрасная няня".** Сериал.
**18.55** "Жди меня".
**20.00** "Время".
**21.05 "Отпуск в наручниках".** Худ.фильм.
**23.15 "Женаты... с детьми".** Сериал.
**00.10 "Без ума от тебя".** Сериал.

### РТР-Беларусь

**07.00** "Доброе утро, Россия!".
**09.20, 19.30 "Однажды будет любовь".** Сериал.
**10.10** "Тайна трех океанов. В погоне за призраком". Док.фильм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** "Вести".
**11.25** "Утренняя почта".
**11.55 "Серебряный самурай".** Худ.фильм.
**13.30, 17.30** "Городок".
**13.50, 16.50, 18.50, 23.45** "Новости — Беларусь".
**14.25, 22.30 "Колдовская любовь".** Сериал.
**15.20 "Дар божий".** Сериал.
**17.55 "Кармелита. Цыганская страсть".** Сериал.
**20.30 "Возьми меня с собой".** Сериал.
**23.30** "Ничего личного".
**23.55** "Вести +".
**00.15** "Мой серебряный шар".

### НТВ-Беларусь

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** "Сегодня".
**06.05** "Сегодня утром".
**08.40** "Чистосердечное признание".
**09.10** "Русские сенсации".
**10.20** "Средний класс".
**11.10** "Кулинарный поединок".
**12.10** "Следствие вели...".
**13.30 "Закон и порядок-3: преступный умысел".** Сериал.
**15.35, 18.30** "Обзор. Чрезвычайное происшествие".
**16.25 "Возвращение Мухтара-2".** Сериал.
**19.40 "Литейный".** Сериал.
**23.25** "Коллекция глупостей" Максима Кононенко.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** "24 часа".
**06.10, 07.45** "Утро. Студия хорошего настроения".
**07.40, 20.10** "СТВ-спорт".
**08.30** "Неделя".
**09.35** "Большой завтрак".
**10.05** "Пять историй".
**10.40 "Ангел-хранитель".** Сериал.
**11.45** "Частные истории".
**12.40, 17.30 "Бывшая".** Сериал.
**13.50** "Звездный ринг".
**15.05** "Лазер Алферова". Док.фильм.
**15.30** "Дорогая передача".
**16.00** "Культурная жизнь".
**16.50** "Я — путешественник".
**17.10** "Наше дело".
**17.20** "Минщина".
**20.00, 22.55** "Столичные подробности".
**20.20** "Добрый вечер, малыш!".
**20.30 "Теоретики".** Сериал.
**21.00 "Волшебник".** Худ.фильм.
**23.00** "Столичный футбол".
**23.30** "Новый год с "Мурзилки International".

### ЛАД

**07.00** "ЛАДное утро".
**08.00** "Альбарутения". Док.фильм.
**08.30, 16.20** "Час суда. Дела семейные".
**09.30** "В этот день".
**09.35** "Медведи-соседи". Док.фильм.
**10.35** "Международный фестиваль циркового искусства".
**12.30** "Пра мастацтва".
**13.00** "Школа ремонта".
**13.55** "Аладдин". Мультсериал.
**14.20** "Внеклассный час".
**14.35** "Бухта капитанов".
**15.15** "Тэлебарометр".
**15.35 "Комиссар Мегрэ".** Сериал.
**17.25** "Простые упражнения с Юрием Афанасьевым".
**18.00 "Любовь как любовь".** Сериал.
**19.00 "Преферанс по пятницам".** Худ.фильм.
**20.55** "Калыханка".
**21.20** "Белорусское "Времечко".
**22.25** "Хоккей. Формула игры".
**22.55** Футбол. Чемпионат Англии. Обзор тура.
**23.50 "На углу у Патриарших-4".** Сериал.

### Мир

**04.55** "Афиша".
**05.00, 06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 00.00, 01.00** "Новости Содружества".
**05.05** "Вместе".
**06.05** "Тик-так".
**06.20** "Болек и Лелек на Диком Западе". Мультфильм.
**06.30, 07.45, 09.35, 10.50** "Удачная покупка".
**06.40 "Бинди: девочка из джунглей".** Сериал.
**07.30** Мультфильм.
**07.55** "Билет на сегодня".
**08.05** "Легкая жизнь".
**08.30 "Перекресток".** Сериал.
**09.45** "Содружество. Live".
**10.05 "Колдовская любовь-2".** Сериал.
**11.05, 23.05 "Мерседес" уходит от погони".** Худ.фильм.
**13.05** "Полди и динозавры". Мультсериал.
**13.30 "Старшеклассники".** Сериал.
**14.05, 01.05 "Милицейская академия".** Сериал.
**14.30** "Вкусный мир". Новогодняя кухня.
**15.20** "Диалог со всем миром".
**16.05, 03.50 "Адъютанты любви".** Сериал.
**17.05 "Не было бы счастья".** Сериал.
**18.20** "Акценты".
**18.30** "Слово за слово".
**19.30 "Дронго".** Сериал.
**20.30** "Общий интерес".
**21.20** "Мир спорта".
**22.05** "Хит-экспресс".
**01.45 "Каникулы Санта-Клауса".** Худ.фильм.

### Белсат

**19.00, 21.00, 23.30** "Аб'ектыў".
**19.05** "Сакрэтная гісторыя архіпелага ГУЛАГ". Дак.фільм.
**19.55** "На колах". Аўтамабільны тэлечасопіс канала "Нямецкая хваля".
**20.20** "Госць "Белсата".
**20.40** "Беларусы ў Польшчы".
**21.20 "Дванаццатая ноч, ці Што заўгодна".** Маст.фільм.

## СПОРТ

# *Ятчанка сышла, Зверава застаецца*

Змагацца за пападанне ў васьмёрку наймацнейшых на Алімпійскіх гульнях 2012 года ў Лондане здольна не менш за 30 беларускіх лёгкаатлетаў, паведаміў БелаПАН галоўны трэнер зборнай, намеснік старшыні Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Анатоль Бадуеў.

На пекінскай Алімпіядзе беларускія лёгкаатлеты заваявалі сем медалёў — залаты, тры сярэбраныя і тры бронзавыя (з улікам узнагарод Івана Ціхана і Вадзіма Дзевятоўскага, якія абвінавачаны ва ўжыванні допінгу і цяпер чакаюць разгляду справы ў Спартыўным арбітражным судзе ў Лазане).

У канцы лістапада зборная па лёгкай атлетыцы ў складзе 75 чалавек прайшла атэстацыю на чарговы алімпійскі цыкл у Міністэрстве спорту і турызму. Як паведаміў Бадуеў, Ціхан і Дзевятоўскі ўключаны ў склад каманды.

Паводле інфармацыі галоўнага трэнера, завяршыла кар'еру 44-гадовая кідальніца дыска Ірына Ятчанка. На адным з турніраў будуць арганізаваны ўрачыстыя праводзіны чэмпіёнкі свету 2003 года, бронзавага прызёра Алімпійскіх гульняў-2000 і 2004 гадоў. А 49-гадовая Эліна Зверава — чэмпіёнка АГ-2000, бронзавы прызёр АГ-1996, чэмпіёнка свету-1995 і 2001 гадоў — рыхтуецца да чэрвеньскага чэмпіянату Еўропы сярод каманд у Нарвегіі, дзе "паспрабуе паспяхова завяршыць кар'еру", сказаў Бадуеў.

**Дзмітрый УЛАСАЎ, БелаПАН.**

## КРЫЖАВАНКА

# Калядна-навагодняя фантазія



**Па гарызанталі:** 1.Верш Максіма Багдановіча ("У бубны дахаў вецер б'е ..."). 4. ... ці студня. На Каляды, каб вызначыць, куды дзяўчына пойдзе замуж, у ... на нітцы апускалі ключ: у які бок ключ пахіліцца — з таго боку будзе жаніх. 8.Каляднае дрэва ў некаторых краінах Скандынавіі. 9.Памяншальна-ласкальная назва лёду. ("Будзь здаровенькі ўвесь год, як калядны лёд". Навагодняе зычанне.) 11.Імя дзяўчынкі з легенды, ад якога пайшла назва возера Нарач. 12.Мясная страва, якая некалі падавалася толькі да святочнага стала на Каляды, Вялікдзень і іншыя святы. 13.Невялікі звярок, які часта сустракаецца ў беларускіх чарадзейных казках. 16.Адна з масак — персанажаў у калядных абрадах беларусаў. 17.Каштоўныя, схаваныя ў тайніку рэчы, якія, як лічыцца, у зімовы перыяд, да Благавешчання, ніхто не зможа знайсці. 20.Музычны духавы клавішны інструмент. 22."Зімовая ...". Верш Змітрака Бядулі. ("Вісіць снежная ноч, вісіць лютая ноч ".) 24.Карысць, добры вынік. 25.Чортава ... — народная назва завірухі як праява дзейнасці нячыстай сілы. 28.Струнны музычны інструмент. 31.Печыва, з якім гаспадар у руцэ клікаў Мароза на калядную вячэру. 32.Свату першая чарка і першая ... (прык.). 33.Ападанне лісця восенню. 34.Чалавек, надзелены магічнымі здольнасцямі: на Беларусі гэта звычайна пчаляр, каваль, млынар.

**Па вертыкалі:** 1.Адна з беларускіх народных назваў планеты Венера ў ранішняй бачнасці. 2.Як гукнеш, так і адгукнецца (прым.). 3.Распластала птушка крылы, ажно сонца засланіла (заг.). 5.Святы, апякун статка: у народным календары прысвятак, які прыходзіцца на 11 лютага старога стылю". ... на масла лас" (прык.). 6.Напалеон ... Выдатны беларускі мастак, кампазітар, пісьменнік, педагог XIX ст. 7."... Цярэшкі". Калядная ігрышча на Беларусі, на тэрыторыі колішніх палачан. 8.Святочная страва беларусаў, якая гатавалася на Каляды і была жаданым пачастункам для калядоўшчыкаў. 10.Каса — дзявочая ... (прык.). На Новы год дзяўчаты касу "замыкалі" — запляталі і ўкладвалі на галаве. 14. ... год канчае, а студзень пачынае (прык.). 15.Памяшканне пры хаце, дзе захоўваецца гародніна. 18.Агароджа, плот з калкоў, на які пасля Калядаў адпраўлялі свае "грахі", звязаныя з забаронай шыць, плесці. 19. ... рогі задраў — на моцны мароз (прык.). 21.Птушка, імем якой на Каляды называлі каршуноў і варон, каб тыя не чынілі школы ў гаспадарцы. 23.Нязменны атрыбут калядоўшчыкаў. 26.У язычніцкай славянскай міфалогіі бажаство ўрадлівасці і плоднасці жанчын. 27.Назва адной з калядных гульняў-карагодаў. 29.Рэшата, альбо ... Рэч хатняга ўжытку, у якую клалі куццю, "бабіну кашу". "Прынесла Каляда рэшата бліноў" (прым.). 30.Дрэва, аб якім на Беларусі здаўна існуе ўяўленне, што яно асвечанае.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**

*г.Дзяржынск.*

**Па гарызанталі:** 1.Завіруха. 4.Калодзеж. 8.Піхта. 9.Лядок. 11.Нара. 12.Каўбаса. 13.Заяц. 16."Цыган". 17.Скарб. 20.Арган. 22.Казка. 24.Толк. 25.Вяселле. 28.Арфа. 31.Бліны. 32.Палка. 33.Лістапад. 34.Чараўнік.
**Па вертыкалі:** 1.Зарніца. 2.Рэха. 3.Хмара. 5.Аўлас. 6.Орда. 7.Жаніцьба. 8.Пірог. 10.Краса. 14.Снежань. 15.Істопка. 18.Частакол. 19.Маладзік. 21.Голуб. 23.Зорка. 26.Ярыла. 27."Лінка". 29.Сіта. 30.Ёлка.

# *Камунікат.org запрашае да супрацоўніцтва беларускіх аўтараў, выдавецтвы і рэдакцыі!*

Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка
КАМУНІКАТ
www.kamunikat.org

Інтэрнэт-бібліятэка Камунікат.org узнікла ў 2000 годзе як прыватная ініцыятыва і стваралася на грамадскіх пачатках. З часам сціплы збор публікацый перарос у буйную бібліятэку, якая сёння з'яўляецца адной з найбольш папулярных бібліятэк у сеціве. Камунікат.org — праект Беларускага гістарычнага таварыства ў Беластоку супрацоўнічае з рэдакцыямі многіх перыядычных выданняў Беларусі і замежжа, з выдавецтвамі і аўтарамі, з навукоўцамі і даследчыкамі, з творцамі розных напрамкаў мастацтва. Па адрасе www.kamunikat.org знойдзеце публікацыі як класікаў беларускай літаратуры, так і маладых пачынаючых аўтараў. Багатыя зборы гістарычнай літаратуры і кніг, недаступных у традыцыйных бібліятэках Беларусі, робяць Камунікат.org крыніцай інфармацыі для студэнтаў і навукоўцаў.

Тут можна таксама пазнаёміцца з навінкамі друку розных краін свету — усё, што выдаецца беларусамі і пра беларусаў, навуковыя даследаванні, слоўнікі, метадычныя дапаможнікі, матэрыялы, якія маюць сувязь з беларускасцю ва ўсіх яе праявах, — усё гэта знойдзеце на старонках інтэрнет-бібліятэкі Камунікат.org.

Камунікат.org у рамках праекта "Беларускія аўтары" дае таксама магчымасць ствараць персанальныя сайты беларускіх пісьменнікаў, публіцыстаў і даследчыкаў, кнігі якіх знаходзяцца ў рэсурсах бібліятэкі.

Распачаў працу новы праект — "Беларускія выдаўцы і выдавецтвы". Тут стварающца інтэрнет-сайты з інфармацыяй пра асобныя беларускія выдавецтвы і выдаўцоў. На сайтах таксама з'яўляецца інфармацыя пра кнігі, выдадзеныя гэтымі выдавецтвамі, якія знаходзяцца ў рэсурсах Камунікат.org.

Праект "Беларускія выдаўцы і выдавецтвы" дае магчымасць больш лёгка вандраваць па зборах Беларускай інтэрнэт-бібліятэкі Камунікат.org, знаёміцца з навінкамі друку і напрамкамі дзейнасці асобных выдавецтваў.

У планах чарговы праект — "Выдавецкія серыі".

Каб пабываць у гэтай бібліятэцы, не трэба выходзіць з дому — дастаткова ўключыць камп'ютэр, не трэба чакаць у чарзе па кнігу — яны даступныя ўвесь час, не трэба плаціць за абанемент — карыстанне бібліятэкай бясплатнае.

Заходзьце і карыстайцеся, калі ласка.

**Антон МУШЫНСКІ.**

*http://kamunikat.org*
**Кантакт:**
*kamunikat@kamunikat.org*,
Skype: *kamunikat*,
Twitter: *http://twitter.com/kamunikat/*

## ВТОРНИК, 29 ДЕКАБРЯ

### Первый

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** "Новости".
**06.05, 00.30** "День спорта".
**06.10, 07.05, 08.10** "Доброе утро, Беларусь!".
**06.45, 07.45, 18.50, 00.25** "Зона Х".
**07.30, 08.30, 11.50** "Деловая жизнь".
**08.35** "Арена".
**09.05, 19.55 "И все-таки я люблю...".** Сериал.
**10.00, 16.45 "Сестры по крови".** Сериал.
**10.50, 17.50 "Не родись красивой".** Сериал.
**11.40** "Зямля беларуская".
**12.10 "Звездный крейсер "Галактика".** Сериал.
**13.10 "Вероника Марс-3".** Сериал.
**14.05** "Ответный ход".
**15.15, 19.20** "Новости региона".
**15.25** "Off Stage Life".
**15.40 "32 декабря".** Худ.фильм.
**19.30** "Сфера интересов".
**21.00** "Панорама".
**21.50** "Итоги-2009. Экономика".
22.20 Торжественное собрание и праздничный концерт, посвященный 10-летию подписания Договора о создании Союзного государства.

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 01.10** "Наши новости".
**06.05** "Наше утро".
**09.05** "Жди меня".
**10.05** "Алексей Ягудин. "Мне повезло с Татьяной".
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 01.25** "Новости спорта".
**11.10** "Один против всех".
**12.00** "Малахов+".
**13.10** "Понять. Простить".
**13.40** "Модный приговор".
**14.45** "Контрольная закупка".
**15.15 "Любительница частного сыска Даша Васильева".** Сериал.
**16.15 "Монтекристо".** Сериал.
**17.10** "Пусть говорят" с Андреем Малаховым".
**18.20 "Моя прекрасная няня".** Сериал.
**18.55 "Рыжая".** Сериал.
**20.00** "Время".
**21.05 "Три дня".** Худ.фильм.
**23.20 "Женаты... с детьми".** Сериал.
**00.15 "Без ума от тебя".** Сериал.

### РТР-Беларусь

**07.00** "Доброе утро, Россия!".
**09.20, 19.30 "Однажды будет любовь".** Сериал.
**10.10** "Пугачева, Распутина... Все звезды Дербенева". Док.фильм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** "Вести".
**11.30** "Ничего личного".
**11.45, 20.30 "Возьми меня с собой".** Сериал.
**13.25, 17.30** "Городок". Дайджест.
**13.50, 16.50, 18.50, 23.30** "Новости — Беларусь".
**14.30, 22.30 "Колдовская любовь".** Сериал.
**15.20 "Дар божий".** Сериал.
**17.55 "Кармелита. Цыганская страсть".** Сериал.
**23.40** "Вести +".
**00.00** "Ландыши для королевы. Гелена Великанова". Док.фильм.

### НТВ-Беларусь

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** "Сегодня".
**06.05** "Сегодня утром".
**09.00** "Борьба за собственность".
**09.30** "Коллекция глупостей Максима Кононенко".
**10.20** "Средний класс".
**11.10** "Квартирный вопрос".
**12.05** "Советские биографии".
**13.30 "Закон и порядок-3: отдел оперативных расследований".** Сериал.
**15.35, 18.30** "Обзор. Чрезвычайное происшествие".
**16.25 "Возвращение Мухтара-2".** Сериал.
**19.40 "Литейный".** Сериал.
**23.25** "Очная ставка".
**00.15** "Особо опасен!".

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** "24 часа".
**06.10, 17.20** "Минщина".
**06.20, 07.45** "Утро. Студия хорошего настроения".
**07.40, 20.10** "СТВ-спорт".
**08.30 "Волшебник".** Худ.фильм.
**10.00** "Пять историй".
**10.40 "Ангел-хранитель".** Сериал.
**11.55, 17.30 "Бывшая".** Сериал.
**13.50** "Шаги к успеху с Алиной Кабаевой".
**14.40 "Элен и ребята".** Сериал.
**15.35** "Top Gear. Русская версия".
**16.50** "Столичный футбол".
**20.00, 22.55** "Столичные подробности".
**20.20** "Добрый вечер, малыш!".
**20.30 "Теоретики".** Сериал.
**21.00, 23.00 "Кушать подано".** Худ.фильм.
**22.00** "С чего начинается Родина".
**23.50** "Неголубой огонек".

### ЛАД

**07.00** "ЛАДное утро".
**08.00** "Альбарутения". Док.фильм.
**08.30, 16.25** "Час суда. Дела семейные".
**09.30** "В этот день".
**09.35, 18.00 "Любовь как любовь".** Сериал.
**10.30 "Преферанс по пятницам".** Худ.фильм.
**12.05** "Страсти по культуре" с Геннадием Давыдько".
**12.45** "Хоккей. Формула игры".
**13.15** Футбол. Чемпионат Англии. Обзор тура.
**14.10** "Кинопробы".
**14.35** "Внеклассный час".
**14.50** "Своя компания".
**15.30 "Комиссар Мегрэ".** Сериал.
**17.25** "Простые упражнения с Юрием Афанасьевым".
**19.00** "Звезды юмора".
**20.15** "Калыханка".
**20.35** "Белорусское "Времечко".
**21.40** Футбол. Чемпионат Англии. "Астон Вилла"—"Ливерпуль". Прямая трансляция.
**23.40** "Спорт-кадр".
**00.10 "На углу у Патриарших-4".** Сериал.

### Мир

**04.55** "Афиша".
**05.00, 06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 00.00, 01.00** "Новости Содружества".
**05.05 "Дронго".** Сериал.
**06.05** "Тик-так".
**06.20** "Болек и Лелек на Диком Западе". Мультфильм.
**06.30, 07.45, 09.35, 10.50** "Удачная покупка".
**06.40, 17.05 "Не было бы счастья".** Сериал.
**07.55** "Билет на сегодня".
**08.05** "Легкая жизнь".
**08.30 "Перекресток".** Сериал.
**09.45** "Содружество. Live".
**10.05 "Колдовская любовь-2".** Сериал.
**11.05, 23.05 "Свидетельство о бедности".** Худ.фильм.
**13.05** Мультфильм.
**13.30 "Старшеклассники".** Сериал.
**14.05, 01.05 "Милицейская академия".** Сериал.
**14.30** "Откровенный разговор".
**15.20** "Детективные истории".
**16.05, 03.50 "Адъютанты любви".** Сериал.
**18.20** "Акценты".
**18.30, 01.45** "Слово за слово".
**19.30 "32 декабря".** Худ.фильм.
**20.30** "Секретные материалы".
**21.20, 02.50** "Живая история".
**22.30** "Диалог со всем миром".

### Белсат

**19.00, 21.00, 22.40** "Аб'ектыў".
**19.10** "МакраФон": XIV фестываль песеннай паэзіі і аўтарскай песні "Бардаўская восень-2007".
**19.40** "Беларускі лес". Дак.фільм.
**20.15** "Акно ў Еўропу".
**20.40** "Асабісты капітал".
**21.20** "Обчына". Дак.фільм.

## СРЕДА, 30 ДЕКАБРЯ

### Первый

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** "Новости".
**06.05, 00.25** "День спорта".
**06.10, 07.05, 08.10** "Доброе утро, Беларусь!".
**06.45, 07.45, 18.50** "Зона Х".
**07.30, 11.55** "Деловая жизнь".
**08.35** "Сфера интересов".
**09.05, 19.50 "И все-таки я люблю...".** Сериал.
**10.00, 16.50 "Сестры по крови".** Сериал.
**10.55, 17.50 "Не родись красивой".** Сериал.
**11.40** "Олимпийский журнал".
**12.10 "Звездный крейсер "Галактика".** Сериал.
**13.10 "Вероника Марс-3".** Сериал.
**14.05, 15.25** "Эпоха".
**15.15, 19.20** "Новости региона".
**15.55, 22.20 "32 декабря".** Худ.фильм.
**19.30** "Земельный вопрос".
**20.50** "Спортлото 5 из 36".
**21.00** "Панорама".
**21.50** "Итоги-2009. Культура".

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.50, 01.10** "Наши новости".
**06.05** "Наше утро".
**09.05 "Рыжая".** Сериал.
**10.00** "Среда обитания".
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.05, 01.25** "Новости спорта".
**11.10** "Детективы".
**11.50, 16.15** "Ералаш".
**12.00** "Малахов +".
**13.10** "Понять. Простить".
**13.40** "Модный приговор".
**14.45** "Контрольная закупка".
**15.15 "Любительница частного сыска Даша Васильева".** Сериал.
**16.40** "Пусть говорят" с Андреем Малаховым".
**18.20** "Смеха ради".
**18.40** "Поле чудес". Юбилейный 1000-й выпуск.
**20.00** "Время".
**21.05 "Тариф новогодний".** Худ.фильм.
**23.10 "Рестлер".** Худ.фильм.

### РТР-Беларусь

**07.00** "Доброе утро, Россия!".
**09.20, 19.30 "Однажды будет любовь".** Сериал.
**10.10** "Жил-был веселый человек. Аркадий Хайт". Док.фильм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** "Вести".
**11.25 "Возьми меня с собой".** Сериал.
**13.05, 17.30** "Городок". Дайджест.
**13.50, 16.50, 18.50, 23.30** "Новости — Беларусь".
**14.30, 22.30 "Колдовская любовь".** Сериал.
**15.20 "Дар божий".** Сериал.
**17.55 "Кармелита. Цыганская страсть".** Сериал.
**20.30** "Лучшие годы нашей жизни".
**23.40** "Ее ледовое величество. Елена Чайковская". Док.фильм.

### НТВ-Беларусь

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** "Сегодня".
**06.05** "Сегодня утром".
**09.00** "Авиаторы".
**09.30** "Коллекция глупостей Максима Кононенко".
**10.20** "Средний класс".
**11.10** "Дачный ответ".
**12.10** "Алтарь Победы".
**13.30 "Закон и порядок-3: преступный умысел".** Сериал.
**15.35, 18.30** "Обзор. Чрезвычайное происшествие".
**16.25 "Возвращение Мухтара-2".** Сериал.
**19.40 "Литейный".** Сериал.
**23.25** "И снова здравствуйте!".
**00.15** "Первая кровь".

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** "24 часа".
**06.10, 17.20** "Минщина".
**06.20, 07.45** "Утро. Студия хорошего настроения".
**07.40, 20.10** "СТВ-спорт".
**08.30** "С точки зрения ангела". Худ.фильм.
**10.00** "Пять историй".
**10.40 "Ангел-хранитель".** Сериал.
**11.30** "Дорогая передача".
**11.55 "Кушать подано".** Худ.фильм.
**13.50 "Чародеи".** Худ.фильм.
**16.50** "Новые путешествия дилетанта".
**17.30 "Бывшая".** Сериал.
**20.00, 22.55** "Столичные подробности".
**20.20** "Добрый вечер, малыш!".
**20.30 "Теоретики".** Сериал.
**21.00, 23.00 "Дочка".** Худ.фильм.
**22.00** "Минск и минчане".
**23.55** "Неголубой огонек".

### ЛАД

**07.00** "ЛАДное утро".
**08.00** "Альбарутения". Док.фильм.
**08.30, 16.25** "Час суда. Дела семейные".
**09.30** "В этот день".
**09.35, 18.00 "Любовь как любовь".** Сериал.
**10.30** Концерт Эмили Симон в Олимпии.
**12.15** "Репортер "Белорусского времечка".
**12.55** "Спорт-кадр".
**13.30** "Аладдин". Мультсериал.
**14.15** "Внеклассный час".
**14.30** "Лабірынты гісторыі беларускіх яўрэяў".
**15.00** "Врачебные тайны".
**15.30 "Комиссар Мегрэ".** Сериал.
**17.30** "Простые упражнения" с Юрием Афанасьевым".
**19.00 "Табор уходит в небо".** Худ.фильм.
**21.10** "Калыханка".
**21.25** "Белорусское "Времечко".
**22.35** Футбол. Чемпионат Англии. Обзор тура.
**23.30 "На углу у Патриарших-4".** Сериал.

### Мир

**04.55** "Афиша".
**05.00, 06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 00.00, 01.00** "Новости Содружества".
**05.05, 13.05, 13.15** Мультфильм.
**06.05** "Тик-так".
**06.20** "Болек и Лелек на Диком Западе". Мультфильм.
**06.30, 07.45, 09.35, 10.50** "Удачная покупка".
**06.40, 08.30, 17.05 "Не было бы счастья".** Сериал.
**07.55** "Билет на сегодня".
**08.05** "Легкая жизнь".
**09.45** "Содружество. Live".
**10.05 "Колдовская любовь-2".** Сериал.
**11.05, 23.05 "Опасные гастроли".** Худ.фильм.
**13.30 "Старшеклассники".** Сериал.
**14.05, 01.05 "Милицейская академия".** Сериал.
**14.30** "История создания".
**15.20** "Реальные истории".
**16.05, 03.50 "Адъютанты любви".** Сериал.
**18.20** "Акценты".
**18.30, 01.45** "Слово за слово".
**19.30 "32 декабря".** Худ.фильм.
**20.30** "День посла".
**21.20, 02.50** "Живая история".
**22.30** "Детективные истории".

### Белсат

**19.00, 21.00, 22.40** "Аб'ектыў".
**19.05** "Праект "Будучыня". Навукова-папулярны тэлечасопіс канала "Нямецкая хваля".
**19.35** "Іншае жыццё". Дак.фільм.
**20.25** "Рэпартэр".
**21.20** "Гісторыя пад знакам "Пагоні": "Еўфрасіння Полацкая".
**21.25 "Кансультацыя ў ружовым садзе".** Серыял.
**22.25** "Асабісты капітал".

**Адрас рэдакцыі:**
**220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.**
**Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.**
**Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906**
**E-mail : nv@promedia.by**
**http://www.nv-online.info**

ISSN 2071-9647

**Падпісныя індэксы: 63222,632222**

**Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ**

**У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, правы ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.**

**Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 23.12.2009 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 21020 экз. Заказ №7026.**